Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 МАЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 102 (28718)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Пісьменнікі прызямляцца ў Гародні**

СТАР. 3

Сямейная газета



**Сяброўства на дзявятым дзясятку**



**Зарабіць на «сабачых хвастах»**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Магу з упэўненасцю канстатаваць, што прамысловасць выйшла з рэцэсіі і набрала ўстойлівыя паказчыкі росту. Тэмп росту прамысловай вытворчасці летась склаў 106,1 %, у гэтым годзе за чатыры месяцы — 108,8 %. Спадзяёмся, што гэты год завершым з такім жа тэмпам. Істотны ўклад у развіццё прамысловага комплексу робяць мадэрнізаваныя галіны апрацоўчай прамысловасці: аўтамабілебудаванне, металургія, нафтахімія, дрэваапрацоўка, лёгкая прамысловасць. Паспяхова асвойваецца вытворчасць легкавых аўтамабіляў. Мы на пачатку шляху, але першыя крокі дазваляюць з аптымізмам ацэньваць патэнцыял беларускага легкавога аўтамабілебудавання».*

ISSN 1990 - 763X

# Сыходзячы са школьнага двара...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Для выпускнікоў сталічнай беларускамоўнай гімназіі № 28, як і для тысяч іншых школьнікаў па ўсёй краіне, прагучаў учора апошні школьны званок.**

■ Праект

## Месца дзеяння

**Калі б не было гэтых людзей, свет быў бы шэры і сумны. Яны, магчыма, маглі б рэалізавацца дзесьці ў горадзе, там, дзе больш шанцаў на поспех. Але засталіся ў сваіх маленькіх населеных пунктах і імкнуцца зрабіць нешта карыснае для сваёй малой радзімы. Новы праект «Звязды» прысвячаецца менавіта ім — рухавікам глыбінкі.**

## ГАЙДА НА «МАЛЬДЗІВЫ»!

**Да чаго ж тут цікава і незвычайна. Побач лес, рэчка з пясчанымі беражкамі, шмат кветак і матылькоў, а паветра якое — дыхаеш і не можаш надыхацца. «А вунь там, — махае кудысьці ў бок паўразбуранага будынка Фёдар, — жывуць хобіты». Ён глядзіць на мой збянтэжаны твар, і вочы яго смяюцца. І дзесьці ў глыбіні душы ва мне прачынаецца дзіця. І адчуванне казкі становіцца вельмі вострым і рэальным.**

### Толкіну б спадабалася

Знаёмцеся — Фёдар Бондараў, непапраўны рамантык і энтузіяст. Родам з Магілёва, але пераехаў на радзіму маці ў вёску Пацяраеўка Слаўгарадскага раёна, гэта зусім побач з тым самым казачным месцам. Наогул ён прадпрымальнік, мае невялічкую пілараму, робіць паддоны. А вось гэта база ў лесе — занятак для душы. Афіцыйная назва яе — база экалагічнага турызму «Маленькія дзівы», або проста — «Мальдзівы». Але нічога не перашкаджае ёй час ад часу ператварацца ў краіну хобітаў.

— Яшчэ ў школе мы з сябрамі вельмі любілі адпачываць тут на рэчцы, і кожны з нас строіў планы наконт гэтага месца, — усміхаецца Фёдар. — Потым усе выраслі і раз'ехаліся, а я рэалізаваў сваю дзіцячую мару.

СТАР. 4

■ Свая справа

## БУРГЕР: НА КОЛАХ І АД ШЭФ-КУХАРА

### Гісторыя, як чатыры сябры зрабілі са старога «мерседэса» мабільную кухню

**Для мяне асабіста гэта пастаянная праблема: спяшаешся па справах, круцішся з раніцы да вечара як у віры і, бывае, няма вольных нават дзесяці хвілін, каб нармальна паесці. І месцы ў нашым, падаецца, зусім не маленькім Мінску, дзе можна перакусіць хутка, смачна і няшкодна, — лічаныя. Праўда, у апошнія гады сітуацыя стала выпраўляцца. І не заўжды за кошт замежных франшыз фастфудаў: беларусы спрабуюць уласнаручна развіць культуру якаснай вулічнай ежы, якой так прагне жыхар горада з хуткім тэмпам.**

СТАР. 15



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі – будзе цікава!

■ Парламенцкі дзённік

# ДАХОДЫ АДНАЎЛЯЮЦЦА,

## але пытанні застаюцца

**Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі на сумесным пасяджэнні задалі пытанні прадстаўнікам урада. У асноўным дэпутаты і сенатары цікавіліся пытаннямі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.**

Спачатку з дакладам перад парламентарыямі выступіў **Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра**. Ён расказаў пра тое, як складваецца эканамічная сітуацыя ў краіне ў апошнія месяцы. І на які кірунак ні зірні — паўсюль рост і станоўчая дынаміка. «За першы квартал у краіну паступіла $1,3 млрд прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове (92 % гадавога прагнозу). Гэта больш, чым за ўвесь мінулы год», — заявіў першы віцэ-прэм'ер. Інвестыцыі ў асноўны капітал у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года выраслі на 16,6 %.

Васіль Мацюшэўскі падкрэсліў, што ў выніку рэалізаваных урадам і Нацыянальным банкам мер Беларусь выйшла на траекторыю росту эканомікі, захавала макраэканамічную стабільнасць і збалансаванасць. «Гэтыя тэндэнцыі падтрымліваюцца і ў 2018 годзе», — сказаў ён. Па выніках першых чатырох месяцаў ВУП прырос на 4,8 %. Гэта вышэй, чым закладзена ў прагнозе сацыяльна-эканамічнага развіцця на бягучы год. «І больш, чым рост сусветнай эканомікі. Тэмпамі, якія апераджаюць эканамічны рост, павышаецца прадукцыйнасць працы па ВУП — 5,4 %», — паведаміў ён.

Васіль Мацюшэўскі запэўніў, што ў Беларусі забяспечана своечасовая выплата заробкаў, пенсій, дапамог насельніцтву, выкананы ўсе сацыяльныя абавязацельствы. «Аднаўлены рост даходаў насельніцтва. Па выніках першага квартала даходы выраслі на 7,6 %, а заработная плата амаль на 14 %. На фоне дастаткова дынамічнага паскарэння эканомікі цанавая сітуацыя ў краіне захоўвае стабільнасць», — падкрэсліў Васіль Мацюшэўскі.

Пасля таго як першы віцэ-прэм'ер скончыў выступленне, па зале пайшлі размовы. Адчувалася, што парламентарыі гатовыя выказаць накопленыя за час працы праблемы. Дыяпазон іх быў шырокі — ад асабістых складанасцяў выбаршчыкаў і асобных прадпрыемстваў да тых, што датычацца маштабу краіны. Напрыклад, **Андрэй РЫБАК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі,** сярод іншага запытаў пра тое, ці магчыма, што да восені гэтага года Беларусь уступіць у СГА.

«Нават працэдура гэта малаімаверна», — адказаў першы намеснік прэм'ер-міністра і дадаў, што пакуль, напрыклад, у ЗША да нас шмат пытанняў, на якія яшчэ давядзецца даць адказы. На яго думку, пры гэтым мадэль дзяржаўнай падтрымкі галін эканомікі выбудавана цывілізавана і значных змяненняў не пацерпіць.

**Ганна КАНАПАЦКАЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы**, задала пытанне пра тое, якія меры зараз прымаюцца, каб знізіць узровень беспрацоўя. У прыватнасці, асабліва гэта актуальна для моладзі. **Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі**, адзначыла, што на люты 2018-га ўзровень агульнага беспрацоўя склаў 5,1 %, ці 260 тысяч чалавек. Эксперты міжнародных арганізацый лічаць, што паказчык 3-5 % — нармальны і паказвае на здаровы рынак працы, які стымулюе людзей павышаць свой прафесійны ўзровень. Міністр пагадзілася з тым, што маладым людзям складана адшукаць працу (сярод іх — 7 % беспрацоўных). Тэндэнцыя тут — на выпраўленне сітуацыі, але кардынальнага паляпшэння можна будзе чакаць толькі падчас больш значнага эканамічнага росту ў краіне.

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу**, прапанаваў змяніць фармат сумеснай працы ўрада і парламента, паступова адыходзіць ад сістэмы, у якой кіраўнік урада ці яго намеснік інфармуе парламентарыяў. Спікер верхняй палаты лічыць, што варта спалучыць у больш цесныя «звязкі» кіраўнікоў профільных пастаянных камісій і міністраў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ПАКАЗЧЫКІ ПА САДЗЕЯННІ ЗАНЯТАСЦІ Ў І КВАРТАЛЕ ВЫКАНАЛІ ЎСЕ РЭГІЁНЫ

**Аб гэтым заявіла міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ падчас прадстаўлення Дэкрэта № 1 аб садзейнічанні занятасці ў Савеце Рэспублікі.**

«Штогод будуць устанаўлівацца паквартальныя значэнні прагнозных паказчыкаў у галіне садзейнічання занятасці насельніцтва — як на рэспубліканскім, абласным, так і на раённым узроўнях, — расказала міністр. — У лютым такія паказчыкі былі зацверджаны. Па выніках першага квартала ўсе рэгіёны іх выканалі».

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Барыс КАВАЛЕЎСКІ** пацікавіўся ў міністра, на якой стадыі знаходзіцца падрыхтоўка пераліку цяжкіх жыццёвых сітуацый. Як адзначыла Ірына Касцевіч, да пачатку чэрвеня з рэгіёнаў дашлюць спісы тых цяжкіх жыццёвых сітуацый, з якімі сутыкнуліся ў працэсе рэалізацыі нормаў Дэкрэта № 3, каб ужо да 1 ліпеня разаслаць гатовыя рэкамендацыі ў камісіі.

У якасці прыкладу такой сітуацыі яна назвала догляд дзіцяці, старэйшага за сем гадоў, якое часта хварэе. Па словах міністра, калі чалавек шукае працу, але ўзровень яго кваліфікацыі і вакансіі ў рэгіёне несупастаўляльныя, то таксама нейкі прамежак часу будзе выдзяляцца. Нагадаем, першы спіс не занятых у эканоміцы будзе сфарміраваны да 1 снежня 2018 года.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### КРЭМЛЬ АДМЯНІЎ НАРАДУ ПА ПАВЫШЭННІ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ

У Крамлі планавалі правесці ў сераду нараду па пенсійнай рэформе з удзелам прэзідэнта Уладзіміра Пуціна, даведаўся РБК. Але яе адмянілі — на ўрадзе па-ранейшаму няма кансалідаванай пазіцыі па павышэнні пенсійнага ўзросту.

У якасці параметраў павышэння прэзідэнту павінны былі прадставіць два варыянты. У сцэнарыі Мінфіна, як пісаў РБК, пенсійны ўзрост прапануецца павысіць для мужчын да 65 гадоў, для жанчын — да 63 гадоў. Варыянт Мінпрацы маркуе павелічэнне ўзросту выхаду на пенсію для жанчын да 60 гадоў, для мужчын — да тых ж 65 гадоў.

Рознагалоссі паміж ведамствамі ліквідаваць не ўдалося, выніковых рашэнняў і канчатковых разлікаў няма, адзначыў суразмоўнік РБК. Ва ўрадзе пралічваюцца і іншыя параметры павышэння пенсійнага ўзросту.

Першы віцэ-прэм'ер і міністр фінансаў Антон Сілуанаў у інтэрв'ю тэлеканалу «Расія 24» сказаў, што калі пенсійны ўзрост пакінуць нязменным, то на аднаго грамадзяніна, які працуе, будзе прыходзіцца два пенсіянеры. «Гэта жудасная сітуацыя. Ніякая структура фінансавая гэтага не вытрымае», — упэўнены Сілуанаў.

### СОРАС ПРАДКАЗАЎ ХУТКІ ГЛАБАЛЬНЫ ФІНАНСАВЫ КРЫЗІС

«Усё, што можа пайсці не так, пайшло не так», — заявіў Джордж Сорас, выступаючы ў Парыжы, і прадказаў наступленне вялікага глабальнага крызісу ў недалёкай будучыні, паведамляе Bloomberg. Еўропе, паводле яго слоў, трэба будзе сутыкнуцца з непазбежнай пагрозай.

Да такога развіцця падзей вядзе рост курса долара і ўцёкі капіталу з рынкаў, якія развіваюцца, лічыць ён. Зрыў ядзернай здзелкі з Іранам і разбурэнне «трансатлантычнага альянсу ЕС і ЗША» абавязкова акажуць негатыўны ўплыў на еўрапейскую эканоміку і выклічуць іншыя ўзрушэнні, у тым ліку дэвальвацыю валют краін, якія развіваюцца, прадказаў мільярдэр. «Мы можам убачыць яшчэ адзін буйны фінансавы крызіс», — цытуе агенцтва Сораса.



Да негатыўных з'яў Сорас таксама аднёс «тэрытарыяльную дэзынтэграцыю», прыкладам якой стаў выхад Вялікабрытаніі з ЕС. «Словы пра тое, што Еўропа знаходзіцца ў экзістэнцыяльнай небяспецы, больш не з'яўляюцца фігурай маўлення, гэта суровая рэальнасць», — сказаў на заканчэнне мільярдэр.

### ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС У ІТАЛІІ АБРЫНУЎ ЕЎРАПЕЙСКІЯ ФІНАНСАВЫЯ РЫНКІ

Як паведамляе ВВС, інвестараў палохаюць перспектывы датэрміновых выбараў і ўзмацненне пазіцый нацыяналістычных партый. Асноўныя еўрапейскія індэксы падалі на працягу 29 і 30 мая. Індэкс капіталізацыі міланскай фондавай біржы FTSE MIB 29 мая страціў 2,7 %, у Брытаніі індэкс FTSE упаў на 1,26%, нямецкі Dax — на 1,58 %, французскі Cac 40 — на 1,3 %. Агульнаеўрапейскі індэкс Stoxx 600 29 мая ўпаў на 1,38 %. Пры гэтым выраслі продажы італьянскіх дзяржаблігацый. Двухгадовыя італьянскія аблігацыі рэзка ўпалі ў цане.

Нагадаем, што пасля выбараў 4 сакавіка 2018 года Італія жыве без урада.

■ Грамадзянская супольнасць

# ЧАС МАЛАДЫХ

## У Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі новы лідар

**Новым кіраўніком БРСМ стаў Дзмітрый Варанюк, які да гэтага ўзначальваў Мінскі абласны камітэт. Яго абралі падчас 43-га з'езда грамадскага аб'яднання, які павінен стаць не толькі справаздачай за мінулыя тры гады, але і зыходным пунктам для новых ідэй і праектаў. Сярод удзельнікаў форуму: рабочая, студэнцкая, сялянская моладзь — 1000 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў Беларусі.**

### Партнёр дзяржавы

Вітальнае слова ўдзельнікам з'езда накіраваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «БРСМ аб'ядноўвае ў сваіх радах тысячы таленавітых, энергічных грамадзян, якія любяць Беларусь. Саюз стаў надзейным партнёрам дзяржавы ў правядзенні маладзёжнай палітыкі, годна працягвае і развівае найлепшыя традыцыі нашага народа», — гаворыцца ў прывітанні.

У рабоце форуму прынялі ўдзел кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА і намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО.



Фота БелТА.

— Сёння нельга быць інертным і пасіўным. Час выбірае смелых і ініцыятыўных. Дзейнасць Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі — гэта перш за ўсё адлюстраванне курса развіцця краіны. Быць саўдзельнікам гэтых працэсаў — вялікая адказнасць і ўнікальная магчымасць паказаць свае сілы, набыць вопыт работы ў камандзе, адкрыць у сабе лідарскія якасці і арганізатарскія здольнасці, сфарміравацца як асобе з цвёрдай грамадзянскай пазіцыяй, — адзначыла Наталля Качанава.

### Наперад разам

«Мы — маладыя, і ў нас усё атрымаецца! Толькі разам і толькі наперад!» — заключныя словы звароту дэлегатаў да беларускай моладзі, які абвясціла «Міс Беларусь» Марыя ВАСІЛЕВІЧ. Яны яскрава перадаюць лейтматыў прадстаўнічага форуму самага буйнога маладзёжнага аб'яднання краіны.

Рухацца наперад натхняла ўдзельнікаў з'езда і навуковы супрацоўнік лабараторыі прыкладной біяхіміі Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Настасся ЛАПКО. На ўласным прыкладзе яна паказала, што можна знайсці час для ўсяго: гадаваць сыноў, здзяйсняць навуковыя адкрыцці і скараць горы. Разам з мужам яны сталі першай беларускай сямейнай парай, якая дасягнула вяршынь Эльбруса і Кіліманджара, замацаваўшы там сцяг Беларусі і БРСМ.

— Ёсць цікавая цытата: «Не імкнецеся жыць ніжэй, каб пазбегнуць падзення». Гэта прынцып нашай сям'і. Я заклікаю моладзь не спыняцца на дасягнутым, а працягваць развіваць свой праект, захапленне, сваё жыццё, быць заўсёды ў развіцці, імкнуцца да нечага, — падзялілася дэлегат.

### Ідэі для Радзімы

Адзін з самых вядомых конкурсаў БРСМ — «100 ідэй для Беларусі». Праект накіраваны на падтрымку навуковай, інавацыйнай актыўнасці моладзі. З 2015 па 2017 год у аргкамітэт конкурсу накіравана больш за 4000 заяў. Сёння задача для маладых навукоўцаў — манетызаваць распрацоўкі. Свой вопыт прадставіў старшы інспектар сектара міжнароднага супрацоўніцтва Універсітэта грамадзянскай абароны МНС, пераможца рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ:

— Наш вядомы праект — ствол «Вікінг» — з'яўляецца адным са складнікаў мадыфікацыі пажарных ствалоў і сёння ўжо манетызуецца. Выпушчана больш за 6000 адзінак. Гэта ўжо прынесла дывідэнды на суму каля 1 200 000 долараў.

Некалькі ініцыятыў прадставіў падчас з'езда цяпер ужо былы першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ. Ён прапанаваў на заканадаўчым узроўні падняць маладзёжны ўзрост з 31 да 35 гадоў, стварыць мнагапрофільныя маладзёжныя цэнтры занятасці і добраўпарадкаваць крыніцы па ўсёй краіне.

Апошнюю ідэю ўжо рэалізуюць актывісты арганізацыі ў Магілёўскай вобласці.

— Моладзь Магілёўшчыны вырашыла пераняць прыклад Прэзідэнта па добраўпарадкаванні крыніц. Сёння мы прывезлі ваду з Трафімавай крыніцы і запрашаем усіх яе паспытаць. Калі ласка, частуйцеся! — прапанаваў Павел АЛЕКСА, першы сакратар Магілёўскай абласной арганізацыі БРСМ.

На пленарным пасяджэнні таксама абмяркоўвалі змяненне статута грамадскага аб'яднання, абралі новых членаў Цэнтральнага камітэта і Цэнтральнай кантрольнай камісіі.

**Марыя ДАДАЛКА**

# МАСТАЦКАЕ СЛОВА: СЯБРОЎСТВА БЕЗ МЕЖАЎ

**У рамках XII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у Гродне пройдзе круглы стол беларускіх і замежных пісьменнікаў «Дыялог літаратур — дыялог культур».**

У госці да гарадзенцаў, у горад легендарнай Каложы і Васіля Быкава, прыедуць пісьменнікі з розных краін. За адзін стол з паэтамі, празаікамі, перакладчыкамі Беларусі для размовы пра ролю мастацкага слова ў гуманітарным развіцці грамадства, у справе захавання прыярытэтаў добрасуседства і міралюбства сядуць калегі з Беларусі і Азербайджана, Латвіі і Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Францыі. Асноўныя арганізатары мерапрыемства — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт, Гродзенскі гарадскі выканаўчы камітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Гродзенская абласная бібліятэка імя Я. Карскага, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура». З просьбай падзяліцца развагамі пра новыя творчы і грамадскі праект мы звярнуліся да **міністра інфармацыі краіны Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА.**

***— Аляксандр Мікалаевіч, што, якія асноўныя пытанні стануць прадметам размоў пісьменнікаў у Гродне?***

— Пісьменнікі на тое і пісьменнікі — каб сабрацца для размовы, паспрачацца, калі ёсць у гэтым неабходнасць, а галоўнае — павесці рэй, наладзіць дыялог узаемаразумення. У тым, што ў Беларусі збіраюцца літаратары розных краін, мы бачым памкненні разгледзець нашу краіну, набрацца ўражанняў пра грамадскае, палітычнае, сацыяльнае развіццё нашай дзяржавы. Вось і зараз, у Гродне, на пісьменніцкім круглым стале мы пагаворым пра прыярытэты, якімі жыве грамадзянская супольнасць нашай краіны, пра тое, з чым мы збіраемся ісці ў заўтра, якія клопаты, турботы цікавяць на-


Фота Кастуся ДРОБАВА

шых маладых людзей, што бачыцца нам праблемным, надзвычай важным у справе выхавання чалавека, у фарміраванні грунту развіцця на заўтра. Кожнаму з літаратараў выбіраць свае сюжэты. Наўрад ці лагічна нешта прамалінейна падказваць, але важна — адчыняць дзверы, быць здольнымі да дыялогу, важна жыць памкненнямі да справядлівага і сумленнага расказу пра час.

***— Магчыма, і традыцыйнае пытанне, але нельга не задаць яго з гэтай нагоды... А ці ведаюць беларускую літаратуру ў свеце?***

— Дзеля гэтага мы і працуем, наладжваем сувязі, непасрэдныя стасункі творчых асоб. Каб ведалі, трэба ісці ў свет, трэба часцей збірацца і выпрацоўваць фарматы адносін, спрыяць развіццю перакладчыцкай справы ў галіне мастацкай літаратуры. Трэба займацца параўнальным літаратуразнаўствам, нельга замыкацца ў сваіх уласных сценах, вобразна кажучы, трымаць зачыненымі дзверы і вокны. Сярод удзельнікаў круглага стала ў Гродне — празаік, паэт, публіцыст, кандыдат сацыялагічных навук, член прэзідыума Саюза пісьменнікаў Расіі Валерый Казакоў. Ён жыве, між іншым, на дзве радзімы — грамадзянін Расійскай Федэрацыі, як выйшаў на пенсію, часта прыязджае ў Беларусь, мае сядзібу на Гарадзеншчыне, між іншым. Дык вось, менавіта дзякуючы Валерыю Мікалаевічу публікацыі многіх цікавых твораў сучасных пісьменнікаў Беларусі з'явіліся ў цэнтральных маскоўскіх і іншых рэгіёнаў Расіі часопісах. Вельмі добрыя стасункі ў беларускіх пісьменнікаў складваюцца з рознымі рэспублікамі, абласцямі Расіі, з Украінай. Вось, напрыклад, у Татарстане толькі што выйшла падрыхтаваная Рэнатам Харысам адметная аўтарская анталогія беларускай паэзіі. Усяго адзін творца, усяго адзін паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі Рэнат Харыс перастварыў на татарскай мове вершы 34 мастакоў слова Беларусі. У Чачні перакладамі беларускай літаратуры займаюцца Адам Ахматукаеў, Лула Куна, Руслан Гадзіеў і іншыя чачэнскія калегі. У Астрахані беларускай паэзіяй, тым, каб яна знайшла свайго чытача ў Расіі, апякуецца Юрый Шчарбакоў. У Калмыкіі сапраўднымі сябрамі беларускай літаратуры сталі Рыма Ханінава, Эрдні Эльдышаў. У Кабардзіна-Балкарыі шмат для прапаганды беларускага мастацкага слова робіць Саліх Гуртуеў. У Дагестане паўнамоцным прадстаўніком беларускай літаратуры, нашым народным дыпламатам з'яўляецца Марат Гаджыеў. Яму спрыяюць іншыя дагестанскія калегі, сярод іх — і лакская паэтэса Міясат Муслімава. У апошнія некалькі гадоў у Баку, Душанбэ, Кіеве, Маскве выйшлі кнігі Алеся Бадака, Міколы Мятліцкага, Алены Масла, Людмілы Рублеўскай, Георгія Марчука, Юрыя Сапажкова і шмат каго яшчэ.

***— Чаго вы чакаеце ад круглага стала беларускіх і замежных пісьменнікаў у Гродне?***

— Вельмі хацелася б, каб надышоў новы віток увагі да беларускай класічнай літаратуры. Хто лепей за Янку Купалу, Уладзіміра Караткевіча, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа здольны расказаць пра нацыянальны характар беларуса?! Прыемна, што перакладчыкі з іншых краін звярнулі ў апошні час увагу на Міколу Купрэева, Анатоля Сыса, Аркадзя Куляшова, Рыгора Барадуліна.

Выдатна, што, акрамя непасрэдна круглага стала, у Гродне пройдзе семінар «Мастацкі тэкст у арыгінале і перакладзе» — у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Да яго працы спрычыніцца і Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы. Дарэчы, забягаючы наперад, заўважу, што музейшчыкі разам з выдавецтвам «Мастацкая літаратура» рыхтуюць выданне санетаў народнага песняра Беларусі Янкі Купалы ў перакладзе на мовы народаў свету. Толькі што гэтыя 22 санеты на свае родныя мовы пераклалі чачэнец Адам Ахматукаеў, чуваш Валеры Тургай, сербка Даяна Лазарэвіч. Дагэтуль існавалі сем перакладаў унікальнага цыкла вершаў класіка беларускай літаратуры на розныя мовы.

Яшчэ адным адрасам літаратурнага сяброўства ў гэтыя дні ў Гродне стане літаратурная імпрэза ў музеі Максіма Багдановіча. Галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Святлана Воцінава прэзентуе праект «Максім Багдановіч і ўвесь свет». Ізноў жа слова вялікага паэта Беларусі будзе гучаць на розных мовах народаў свету.

***— Што ж, уражальная літаратурна-мастацкая пляцоўка разгортваецца ў Гродне. Застаецца пажадаць усім поспеху ў яе адладжанай рабоце!***

— А я хацеў бы ў сваю чаргу выказаць словы ўдзячнасці гродзенскім абласным і гарадскім уладам за падтрымку такога, як на мой погляд, важнага творчага праекта. Асабістае спрыянне старшыні аблвыканкама Уладзіміра Краўцова, яго памагатых — Віктара Лісковіча, Мечыслава Гоя, Аляксандра Вярсоцкага, іншых аўтарытэтных асоб, рэктара Гродзенскага ўніверсітэта Ірыны Кітуркі, дапамагло ў арганізацыі і круглага стала, і іншых літаратурных імпрэз у Гродне. Асабліва прыемна, што ўсе літаратурныя сустрэчы адбываюцца ў час правядзення чарговага Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, уваходзяць у яго праграму. Веру, што з часам да круглага стала — а ён проста павінен стаць у Гродне традыцыйным — спрычыніцца і гродзенская літаратурная моладзь. Ім, сённяшнім маладым паэтам, празаікам, юным літаратуразнаўцам, пачаткоўцам, стварaць літаратурны партрэт Беларусі заўтра.

**Гутарыў Сяргей ШЫЧКО.**

## ■ Міжнароднае супрацоўніцтва

# ПРЫЯРЫТЭТ — САЦЫЯЛЬНЫМ ПРАЕКТАМ

### На што ідзе гуманітарная дапамога

**У гуманітарным кірунку наша краіна супрацоўнічае больш чым з сотняй дзяржаў. Прыярытэт аддаецца праектам у сферы адукацыі, абароны навакольнага асяроддзя, аховы здароўя. Так, у нас заключана 14 дагавораў з замежнымі дзяржавамі на аздараўленне дзяцей. За 30 гадоў такой магчымасцю скарысталіся каля мільёна дзяўчатак і хлопчыкаў.**

Усе краіны, з якімі супрацоўнічае Беларусь, маюць пэўную нішу. Напрыклад, Германія накіроўвае сродкі на падтрымку ахвяр халакосту, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, стварэнне рэсурсазберагальных тэхналогій. Аўстрыя забяспечвае функцыянаванне SOS — Дзіцячых вёсак. Кітай, Вялікабрытанія рэалізуюць адукацыйныя праекты. ЗША пастаўляе лекавыя сродкі і медыцынскае абсталяванне.

— У пачатку года быў зацверджаны комплекс мер па прыцягненні замежнай бескарыснай дапамогі ў рэспубліку. Асноўная мэта дадзенага дакумента — актывізаваць дзейнасць дзяржаўных органаў па супрацоўніцтве з замежнымі і беларускімі партнёрамі. Вынікам стане павелічэнне колькасці гуманітарных праектаў, — адзначыла **начальнік упраўлення гуманітарнай дзейнасці дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Інга ГАРБУНЦОВА.**

Беларусь, у сваю чаргу, вядома як краіна-донар у пытаннях надзвычайнага рэагавання. **Афіцыйны прадстаўнік МНС Віталь НАВІЦКІ** расказвае, што з 1999 года мы больш за 60 разоў аказвалі дапамогу іншым дзяржавам. Часцей за ўсё размова ішла пра надзвычайныя сітуацыі прыроднага характару. Але былі і гуманітарныя аперацыі ў краіны, дзе людзі пацярпелі ў выніку ўзброеных канфліктаў, — напрыклад у Сірыю, Эквадор, В'етнам, Украіну.

— Акрамя гэтага, МНС гатова аказваць дапамогу і спецыялістамі, — дадае Віталь Навіцкі. — Нашы супрацоўнікі выляталі ў Сербію, калі там былі моцныя паводкі, у Грузію на ліквідацыю складаных пажараў. Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння МНС Беларусі атэставаны па лініі ААН як атрад цяжкага класа: гэта азначае, што мы здольныя аўтаномна працаваць у любым пункце зямнога шара. Такіх атрадаў не больш за 20 у свеце.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■

## ■ Жыллё

# Што замінае будаўніцтву прыватных арэндных дамоў?

**На гэтае пытанне журналісту БелТА адказаў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

У прыватнасці, начальнік упраўлення заўважыў, што пакуль не ўдаецца дасягнуць кансэнсусу з усімі зацікаўленымі па механізме прыцягнення замежных інвестараў.

«Для гэтага трэба сфарміраваць заканадаўчую базу. Існуе два варыянты, — растлумачыў Аляксандр Горваль. — Інвестару можна даць прэферэнцыі, у тым ліку падатковыя, за кошт гэтага ў яго выдаткі памяншаюцца, ён будуе жыллё і здае яго ў арэнду па прымальнай цане. Іншы варыянт — ён будуе ў агульных эканамічных умовах, плаціць усе падаткі, зборы, удзельнічае ў таргах, выкупляе зямлю, але потым цана арэнды атрымліваецца ў разы вышэйшай за існуючую. У гэтым выпадку дзяржава пачне даціраваць грамадзян, якія арандуюць жыллё. У любым выпадку яна павінна ісці на саступкі»

■

## ■ А не шкодзь!

# ЭКСКЛЮЗІЎ АКАЗАЎСЯ ПАДРОБКАЙ

**Магілёўскія мытнікі зацікавіліся гандлярамі з Расіі, якія займаліся тым, што пад выглядам канфіскату скураных вырабаў амаль за паўцаны прадавалі тавар сумнеўнага паходжання.**

Ілжэпрадпрымальнікі загадзя расклейвалі па горадзе афішы і гандлявалі ўсяго дзень. Калі паходжаннем іх тавару пацікавіліся магілёўскія мытнікі, тыя не змаглі прадставіць неабходныя дакументы, якія пацвердзілі б легальнасць дастаўкі адзення і абутку, яго паступлення і дазволу на продаж. Усяго планавалася рэалізаваць 54 адзінкі верхняга адзення і 22 пары ботаў і туфляў агульным коштам больш чым 15 тысяч беларускіх рублёў.

Па факце парушэння заканадаўства магілёўская мытня пачала адміністрацыйны працэс, парушальнікам пагражае штраф у памеры да 50 % ад кошту тавару.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

## ■ На слыху

# ХАБАР — $200 ТЫСЯЧ

**Як расказалі «Звяздзе» ў прэс-службе КДБ, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Гродзенскай вобласці Сяргей РАЎНЕЙКА быў затрыманы з доказамі злачынства пры вымаганні і атрыманні хабару ў памеры 200 000 долараў ЗША.**

У дачыненні да затрыманага заведзена крымінальная справа па частцы 3 артыкула 430 «Атрыманне хабару» Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Пад дзеянне трэцяй часткі артыкула Раўнейка трапляе як асоба, якая займае адказную пасаду, а таксама як той, хто атрымаў хабар у асабліва буйным памеры, гэта значыць ён больш чым у тысячу разоў перавысіў памер базавай велічыні. Санкцыя артыкула — пазбаўленне волі на тэрмін да пятнаццаці гадоў з канфіскацыяй маёмасці, а таксама пазбаўленне права займаць пэўныя пасады.

Цяпер падазраваны знаходзіцца ў СІЗА КДБ Рэспублікі Беларусь і дае прызнальныя паказанні. У гэты час спецыялісты праводзяць неабходныя аператыўна-вышуковыя і следчыя дзеянні, накіраваныя на ўсталяванне ўсіх фактаў і ўдзельнікаў супрацьпраўнай дзейнасці.

— У поле зроку аператыўных падраздзяленняў Сяргей Раўнейка трапіў больш за год таму ў сувязі з інфармацыяй пра неаднаразовыя факты атрымання хабару ад розных асоб за вырашэнне пытанняў, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю. З санкцыі кіраўніка дзяржавы праведзены аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы па дакументаванні супрацьпраўнай дзейнасці службовай асобы. Пры атрыманні чарговага хабару ён затрыманы з грашыма ў руках, — паведамілі ў КДБ.

**Дар'я КАСКО**

# ГАЙДА НА «МАЛЬДЗІВЫ»!



Гарбата з чаборам, калі ласка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Два гады таму Фёдар гучна заявіў пра сябе, стварыўшы ў маленькім населеным пункце Дзіцячы цэнтр лагічнага мыслення. Што гэта такое, прызнаецца, сам тады толкам не ўсведамляў. Проста хацеў стварыць такое месца, дзе дзецям нічога б не перашкаджала заставацца такімі, якія яны ёсць. Бо снедаць па раскладзе, класціся ў ложак адразу ж пасля «Калыханкі», выконваць іншыя даручэнні дарослых — гэта сумна. І Фёдар стварыў усе ўмовы для творчасці.

Увасобіць мару ў жыццё дапамаглі мясцовыя ўлады пры падтрымцы ў рамках праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Так з'явіўся новы будынак з усімі выгодамі, унутры — і месцы для адпачынку, і зала для снедання, і гульнявы лабірынт з сухім басейнам з рознакаляровымі шарыкамі, горкамі, тунелямі, сценкай для скалалажання.

## Бліжэй да прыроды

Тут усё зроблена з экалагічным ухілам. Нават пакоі нагадваюць палаткі, але ж пад надзейным дахам. У такіх палатках ніякі холад і дождж не палохаюць. За вокнамі шпакоўні, прычым зроблены яны з такім разлікам, каб дзеці маглі назіраць за паводзінамі птушак. На сценах — дзіцячыя малюнкі.

— Мы папрасілі дзяцей намаляваць, як яны бачаць месца, дзе хацелі б адпачыць, — расказвае Фёдар. — Іх пажаданні выкарыстоўваліся пры пабудове. А некаторыя хутка ажыццявяцца. Вунь, бачыце, нехта намаляваў домік на дрэве. І ён будзе.



Марыя КАРШАКЕВІЧ у «Мальдзівах» галоўная па арганізацыйных пытаннях.

На сцяне — «мальдзіўскі» сцяг. Будзе і спецыяльны «мальдзіўскі» гімн. Але яго павінны прыдумаць самі дзеці. Наогул для дзіцячай фантазіі тут сапраўднае раздолле. Кожная зона прадумана так, каб па максімуме задзейнічаць мысленне падлеткаў. Ёсць столік хіміка, фізіка, мастака. Навошта? Для таго, каб школьнікі маглі спалучаць прыемнае з карысным. База будавалася з такім разлікам, каб тут маглі не толькі адпачываць, але і вучыцца. І Магілёўскае абласное ўпраўленне адукацыі дало на гэта дабро. Першыя заезды магілёўскіх школьнікаў адбыліся яшчэ зімой. Пасля заяўкі пасыпаліся адусюль. І толькі складанасці з ацяпленнем прымусілі адкласці актыўнае задзейнічанне базы да цёплага перыяду.

## На месцы былой гідраэлектрастанцыі

У савецкі час на гэтым месцы планавалі паставіць невялічкую гідраэлектрастанцыю, але, пакуль адбывалася будоўля, актуальнасць у яе існаванні прайшла. Зямлю разам з будынкамі перадалі калгасу «Жалезінскі», але з развалам Савецкага Саюза калгас таксама распаўся і месца прыйшло ў заняпад. Фёдару дасталася ў спадчыну некалькі паўразбураных будынкаў. Першапачаткова нават разглядаўся варыянт зрабіць у адным з іх базу. Аднак хутка прыйшлося адмовіцца.

— Па праекце мы павінны былі паскорыцца, каб атрымаць грошы, — згадвае ён той перыяд. — У будаўніцтва былі ўкладзены 19 тысяч долараў, якія нам выдзелілі па праекце, і 19 тысяч сваіх. Грошы патраціў за першы месяц і вельмі хваляваўся, як быць далей: не было больш рэзерваў. Прыйшлося браць крэдыт на 30 000 рублёў, каб укласціся ў тэрміны. А праз 11 месяцаў адбылося ўрачыстае адкрыццё. Некаторыя не верылі, што ўсё атрымаецца, але памыліліся. І гэта быў першы крок. Потым мы напісалі яшчэ некалькі праектаў і перамаглі. У выніку ў нас з'явілася лодка, гіраскутары, веласіпеды, батут, мячы, сетка і іншы інвентар. Потым дзякуючы міжнароднай дапамозе купілі мэблю, абсталяванне для санвузлоў. Так за два гады выраслі з Дзіцячага цэнтра лагічнага мыслення ў базу экалагічнага турызму.

Пакуль што ўсе грошы ідуць на развіццё базы. Але Фёдар не сумуе, спадзяецца, што ўсё будзе добра. Не губляць надзею яму дапамагаюць сябры і аднадумцы. Першая яго памочніца Марыя Каршакевіч, у яе таксама бацькі з Пацяраеўкі. Яна займаецца арганізацыйнымі пытаннямі, а яе маці адказвае за ландшафтны дызайн, упрыгожвае тэрыторыю базы — а гэта больш за 6 гектараў зямлі — кветкамі. Магіляўчанін Аляксандр Пятроў арганізуе музычнае суправаджэнне падчас мерапрыемстваў. Дапамагаюць людзі, якія працуюць на піларамe. А яшчэ — Слаўгарадскі райвыканкам і асабіста яго старшыня Канстанцін Жыгуцкі. А таксама Лапаціцкі сельсавет, на тэрыторыі якога знаходзіцца база.

## У краіне хобітаў і Гары Потэра

Спатрэбіўся і паўразбураны закінуты будынак былой гідраэлектрастанцыі. Пакуль што ён выкарыстоўваецца для фантазійных гульняў. Тут час ад часу «жывуць» гномы, гобліны, эльфы, чараўнікі — вялікі магічны свет, дзе ідзе пастаянная барацьба паміж дабром і злом. І ў гэтай барацьбе дзеці вучацца адрозніваць дрэннае ад станоўчага, ворага ад сябра, цаніць сяброўства і, нягледзячы на складанасці, якія сустракаюцца ў жыцці, заставацца шчодрымі, добрымі, дапамагаць іншым.

— Казкі — гэта яшчэ адзін наш кірунак, — кажа Фёдар. — Тэма, дзе можна аб'яднаць смелыя фантазіі і прыроду. Мы нават касцюмы закупілі для такіх гульняў, каб цалкам акунуцца ў містычны свет.

Заходзім у будынак, дзе арганізатары нядаўна праводзілі квэст у духу Гары Потэра. Шэрыя сцены, стол пасярэдку — сапраўды адчуваецца нейкая містыка.

— Таямнічасці надавалі свечкі, фіранкі на вокнах, карціны. Вунь там, на другім паверсе, была лаўка Гары Потэра, дзе хобіт прадаваў чарадзейныя палачкі, — расказвае Фёдар. — Дзеці сядзелі за сталамі, вывучалі траўкі, потым ішлі на вуліцу, дзяліліся на каманды і шукалі гэтыя расліны.

На вуліцы — невялічкія альтанкі, напоўненыя духмяным сенам. Добрае месца для адпачынку, але падчас гульні гэта не што іншае, як жытло хобіта. Хутка тут з'явяцца і экзатычныя жывёлы. Поні ў Фёдара ўжо ёсць — гуцульскі. Ці, як ён яго яшчэ называе, — арабскі скакун у мініяцюры.

## Прыгоды для «мальдзіўцаў»

Увесь май на тэрыторыі базы адпачывалі і адначасова вучыліся школьнікі першых —чацвёртых класаў з 39-й, 33-й , 31-й і 42-й магілёўскіх школ. Чатыры ўрокі вучыліся, потым глядзелі дакументальны фільм, у якім даступна расказваецца, як захаваць прыроду і пазбегнуць экалагічнай катастрофы. Апошні, пяты, урок быў выязны, каб замацаваць атрыманыя веды.

— Будуем праграму зыходзячы з таго, што цікавіць дзяцей, — кажа Фёдар. — Калі ім падабаецца займацца вынаходніцтвам, нешта прыдумваем, шукаем цікавыя ідэі ў інтэрнэце і ўвасабляем іх у жыццё: гуляем у хобітаў, робім крэатыўныя карціны, ліхтарыкі, кветкавыя вазоны і шмат чаго іншага. Плануем пабудаваць хатку на дрэве, зрабіць невялічкае возера з экзатычнымі рыбкамі. Дзяцей спачатку трэба зацікавіць, а потым ужо развіваць. Магчыма, у кагосьці талент раскрыецца. Будзем вучыць, як выжываць у лесе, як арыентавацца на мясцовасці, як пабудаваць часовае жыллё.

— Навошта вам усё гэта трэба? — спрабую справакаваць суразмоўніка.

— Проста цікава, хочацца зрабіць нешта такое, каб прыносіла карысць. Вельмі хочацца паказаць дзецям, які прыгожы наш свет. Я не прэтэндую на ролю сэнсэя ад жыцця. Але першае правіла — гэта беражлівае стаўленне да прыроды, развіццё любові да яе. І вучоба жыць у згодзе з навакольным светам — жывёламі, птушкамі. Умець выходзіць з канфліктных сітуацый, не сварыцца, быць добрымі і спагадлівымі.

Ужо калі была дома, злавіла сябе на думцы, што зноў хочацца паспрабаваць той духмянай гарбаты з чаборам, якую мы разам з Фёдарам і Машай пілі на ўтульнай «мальдзіўскай» кухні. І быццам лёгкі лясны ветрык датыкнуўся да маёй шчакі і паклікала рэчка з прыгожай назвай Раста. А можа, гэта ўсё чараўніцтва хобітаў, якія дзякуючы Фёдару абараняюць гэтыя мясціны і клічуць да сябе ў госці?

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Сцяпан БАЙЦОЎ, старшыня Лапаціцкага сельвыканкама:**

— Месца для базы экалагічнага турызму проста выдатнае. Фёдара ведаю як чалавека неабыякавага, якому цікава нешта рабіць для іншых. Таму, калі праводзіў сустрэчу, дзе мы размаўлялі аб развіцці рэгіёнаў, запрасіў і яго. І Фёдар купіў за адну базавую гэты ўчастак з пабудовамі. У выніку паявіўся праект па адкрыцці Дзіцячага цэнтра лагічнага мыслення. Ён перамог, былі выдзелены грошы, і пачалася работа. Да апошняга я сумняваўся, наколькі гэта перспектыўна. Бо трэба было браць гэта ўсё пад сваю адказнасць і ставіць пячатку. Нават не спаў ноч, а ў восем раніцы прыйшоў у кабінет, завізіраваў і супакоіўся. Цяпер бачу, што ўсё атрымалася.

# ПАД МІНСКАМ ТАНКІ ГРУКАТАЛІ...



**На аэрадроме Міністэрства па надзвычайных сітуацыях «Ліпкі» гэтымі днямі курыцца пыл і дрыжыць зямля. Гэта механізаваная калона рыхтуецца да параду войскаў Мінскага гарнізона ў гонар Дня Незалежнасці, які традыцыйна пройдзе 3 ліпеня каля абеліска «Мінск — горад-герой». Адзін за адным едуць магутныя браніраваныя машыны, зенітныя ракетныя комплексы, сістэмы залпавага агню і артылерыйскія ўстаноўкі, якія стаяць на ўзбраенні ў беларускага войска. Карэспандэнты «Звязды» паназіралі за падрыхтоўкай вайскоўцаў да відовішча.**

Ужо вядома, што ў складзе механізаванай калоны перад гледачамі праедуць 23 парадныя разлікі, якія будуць налічваць больш за 250 адзінак ваеннай тэхнікі. Акрамя таго, вайскоўцы сфарміруюць 18 пешых парадных разлікаў.

— Сярод іншага, у склад калоны ўвойдуць новыя і мадэрнізаваныя на айчынных прадпрыемствах узоры ваеннай тэхнікі. Гэта бронеаўтамабілі «Дракон», артылерыйская сістэма «Нона М1», бронетранспарцёр БТР-70МБ1, — паведаміў **намеснік камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёр Уладзімір КУЛАЖЫН.**

Экіпажам БТР-70МБ1 камандуе **старшы лейтэнант Яўген МІЛЕЎСКІ.** Гэта ўжо пяты парад, да якога ён рыхтуецца.



— БТР-70МБ1 быў мадэрнізаваны ў Беларусі. У ім усталяваны больш магутны рухавік, крыху відазменены корпус, зроблены двухстворчатыя люкі для большай зручнасці ўваходу і выхаду асабовага складу з баявой тэхнікі. Бронетранспарцёр атрымаў новыя тармазы і каробку перадач. Таму хоць і давялося папрацаваць падчас навучання, але ніякіх складанасцяў у кіраванні тэхнікай няма. Механіка-кіроўцу навучаюць азам спецыяльнасці тры месяцы. Гэта рух у калоне і само кіраванне бронетранспарцёрам. Калі ж салдат быў прызваны ўжо з правамі, то перавучыцца будзе нескладана. Адзінае «але» — меншы агляд і больш складаная каробка перадач. Разам з тым БТР-70МБ1 — машына вельмі манеўраная і не саступіць у гэтым звычайным аўтамабілям.

А з люка браніраванай машыны тым часам вылазіць **механік-кіроўца Мікіта ЗАЙЦАЎ.** У разлікаў — рэгламентаваны перапынак, і таму паспяваем крыху пагутарыць з салдатам:

— Я служу ўжо паўгода. Вучымся трымаць дыстанцыю, ехаць з аднолькавай хуткасцю. Гэты парад для мяне першы, але хвалявання няма. Ад спёкі, якая ўсталявалася апошнімі днямі, ратуемся кандыцыянерам. За дзень мы тут праязджаем прыкладна 10 кругоў. Кожны з іх мае працягласць у два кіламетры.

На аэрадроме «Ліпкі» вайскоўцы трэніруюцца ўжо трэці тыдзень. Тэхніка праходзіць па аўторках, серадах і чацвяргах. Па рэгламенце, падрыхтоўка тут зойме яшчэ прыкладна два тыдні. А 23 і 28 чэрвеня генеральныя рэпетыцыі пройдуць ужо непасрэдна каля стэлы ў Мінску. Агульная працягласць параднага разліку складзе каля трох кіламетраў!

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА**

Сямейная газета
Выпуск № 10 (101)



## ДЗЕНЬ «ДЗЯКУЙ»

Што вы робіце перад сном? Чарговы раз праглядаеце стужку навін у «Фэйсбуку» ці серыял па тэлебачанні? Складаеце план на заўтра? Я вось ужо каторы месяц, лежачы ў ложку, прамотваю ў памяці дзень, які мінуў, і дзякую. Спачатку з цяжкасцю прыгадвала пяць пунктаў, зараз жа, не паверыце, не магу спыніцца...

Гэты рытуал раю выконваць у цішыні. Заплюшчыце вочы і падумайце, каму і за што вы ўдзячныя ў дні, які адыходзіць. Падзякуйце калегу, які падстрахаваў на працы, бармену за смачную каўку, мужу ці жонцы, якія проста былі побач... Можна нават завесці дзённік удзячнасці і запісваць туды ўсе маленькія і вялікія радасці вашага жыцця. Цёплы ложак, усмешка дзіцяці, смак шакаладу, зорнае неба... Так шмат усяго, за што можна быць удзячным! Трэба проста шырэй расплюшчыць вочы і менш глядзець сабе пад ногі.

З пункту гледжання пазітыўнай псіхалогіі, удзячнасць — гэта эмоцыя, якая дае жыццёвую энергію і выдатна матывуе. Засынаючы са станоўчымі думкамі, вы настройваеце сябе на працяг ланцужка дабрыні заўтра.

У Амерыцы, дзе зараз жыве мая сястра, ёсць цудоўнае свята «Дзень дзякавання». Яго амерыканцы шануюць не менш, чым уласны дзень нараджэння. І не дзіўна, бо яно нагадвае пра важнасць адчування ўдзячнасці да людзей, лёсу, Бога. Мне падаецца, было б цудоўна зрабіць кожны дзень нашага жыцця «Днём «дзякуй». Бо, як казаў адзін індыйскі мудрэц, калі сэрца напоўнена ўдзячнасцю, любыя дзверы, якія падаюцца зачыненымі, могуць прывесці да незвычайных адкрыццяў.

Калі я расказвала пра сваю новую традыцыю знаёмым, некаторыя з іх рэагавалі скептычна. Маўляў, вядома, можна дзякаваць, калі ў цябе ўсё добра. А вось у мяне не жыццё, а выпрабаванні. Муж п'е, дзеці не апраўдалі чаканняў, начальнік несправядлівы, праца нелюбімая, ды яшчэ хваробы напаткалі... Гэты спіс можна працягваць. Ва ўсіх песімістаў ён прыблізна аднолькавы. Яны лічаць: ім няма за што дзякаваць, ды і няма каму.

Але ж найвышэйшая мудрасць і заключаецца менавіта ў тым, каб навучыцца быць удзячным нават людзям, якія зрабілі табе штосьці дрэннае, лёсу, які падкінуў чарговае выпрабаванне. Нездаволенасць жа, праверана, не прыносіць ні шчасця, ні дабра. Яна толькі замацуе вас у вашым стане.

Адна манашка, якая здзяйсняла паломніцтва, прыйшла ў незнаёмую вёску на заходзе сонца. Папрасіла прытулку на ноч, але ўсе мясцовыя жыхары зачынялі перад ёй дзверы. Яны былі іншай веры і «не маглі» пакінуць у сябе жанчыну.

Начлег манашцы дала вішня ў адкрытым полі. Ноччу было па-сапраўднаму холадна і жанчына не магла заснуць... Апоўначы яна зірнула ўгору і ўбачыла, як кветкі вішні, якія распусціліся, усміхаюцца туманнаму месяцу. У гэты момант манашка адчула ў душы неверагодную цеплыню. Яна ўстала з зямлі і зрабіла паклон у бок вёскі: «Дзякуючы гэтым людзям я засталася без даху над галавой і знайшла саму сябе ноччу пад квітнеючай вішняй і туманным месяцам».

Жыццё цудоўнае. Кожны момант мае для нас тысячу падарункаў. Але мы так часта зацыкліваемся на няўдачах і на благім (замест таго, каб падзякаваць за чарговы ўрок), што не заўважаем іх. Паспрабуйце прымаць усё, што прыносіць жыццё, з удзячнасцю і паглядзіце, што атрымаецца...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Сакрэт поспеху

# «НЕ ЎЯЎЛЯЮ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ БЕЗ ГРОШАЙ»

## Як пінчанка, стрыгучы сабак, зарабіла сабе на лецішча ды машыну

**Тамары Мазоль усяго 30, але яна ўжо з'яўляецца топавым грумерам у нашай краіне (спецыяліст, які займаецца доглядам вонкавага выгляду жывёл. — Аўт.). Дзяўчына не раздумваючы пагадзілася падзяліцца сакрэтам свайго поспеху. Сустрэліся мы зранку, пасля яе трэніроўкі па тайландскім боксе.**
**Ім Тамара займаецца ўжо сёмы год. Нават летась заняла трэцяе месца на чэмпіянаце рэспублікі. На гадзінніку 11.00, а дзяўчына паспела не толькі патрэніравацца, але і крыху папрацаваць. «Пакуль чакала вас, абнавіла ў «Інстаграме» тры акаўнты. Змясціла новыя прыгожыя фотаздымкі, падпісала іх, паставіла хэштэгі і зрабіла пераадрасацыю ва ўсе сацсеткі. Раблю гэта, як толькі з'яўляецца вольная хвілінка. Мне трэба пастаянна нагадваць пра сябе. Я ж не толькі сабак стрыгу, але і вучу гэтаму майстэрству іншых. Акрамя таго, займаюся развядзеннем дэкаратыўных вожыкаў».**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*



«Ператварыць» сабаку ў тыгра? Лёгка!

■ Вам і не снілася...

# КАХАННЕ БЕЗ УЗРОСТУ


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Галіна Сяргееўна і Іван Майсеевіч пазнаёміліся чатыры гады таму...

**Кажуць, калі жанчына не паспела выйсці замуж да 30 (у кожнай сям'і свая «мяжа невяртання»), — пішы прапала. Сядзець табе, моцнай і незалежнай, у акружэнні катоў і адзінока ўсхліпваць пад меладрамы. Але жыццё паказвае, што сустрэць свайго чалавека ніколі не позна. Летась, напрыклад, каля тысячы беларусак пабраліся шлюбам пасля 60 гадоў. Вядома, пазнаёміцца на пенсіі з прадстаўніком супрацьлеглага полу становіцца складаней, але ж магчыма! Тым больш быць адзінокім шкодна для здароўя. Навукоўцы з Каліфарнійскага ўніверсітэта прыйшлі да высновы, што ў пажылых, якія адчуваюць сябе пакінутымі, рызыка памерці раней павялічваецца на 10 працэнтаў. Таму мы сабралі некалькі гісторый пра тое, як знайсці спадарожніка, калі табе крыху «за».**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Гэта па-нашаму!

**Ці задумваліся вы аб тым, што губляюць дзеці, якія растуць без казак? Займальныя сюжэты дапамагаюць выхоўваць малечу. У казках гаворыцца пра сяброўства, бескарыслівую дапамогу, імкненне да справядлівасці, асуджаюцца няўдзячнасць і здрада, высмейваюцца фанабэрыя, зайздрасць, баязлівасць, гультайства.**

# РАСКАЖЫ, БАБУЛЯ, КАЗКУ

А як не сказаць пра сакавітую, вобразную, багатую на трапныя параўнанні і характарыстыкі мову беларускіх казак! Між іншым, ці ўпэўнены вы, што ўмееце іх расказваць? Калі б толькі чулі сапраўдных майстроў гэтага жанру, якія сабраліся на міжнародным форуме казкі ў Акадэміі навук, зразумелі б, што пры дапамозе казачнай гісторыі можна і насмяшыць, і расчуліць, перадаць прыгажосць прыроды, пазнаёміць з народнымі традыцыямі. Нават адну і тую ж казачку можна расказваць па-рознаму, дадаваць новыя дэталі, уплятаць у яе песні.

Радуе, што ў розных кутках Беларусі краязнаўцы, педагогі і нават бібліятэкары спрабуюць «раскручваць» беларускую казачную спадчыну. Напрыклад, на Любаншчыне ладзіцца фестываль казкі, а ў мінулым годзе выйшла шыкоўная кніга з чароўнымі гісторыямі, запісанымі ў розных вёсках раёна.


Ларыса Рыжкова з Міханавіцкага дома фальклору ведае, як паднесці казку дзеткам.

У Міханавіцкім доме фальклору казкі не толькі збіраюцца, але і выконваюцца сучаснымі дзеткамі. «У іх разбіраецца шмат цікавых сітуацый. Праз нeверагодныя гісторыі дзеці пазнаюць жыццё, — расказвае **кіраўнік узорнага фальклорнага ансамбля «Калыханка» Ларыса РЫЖКОВА.** — На казках я вучу малых адчуваць народную інтанацыю, працаваць з голасам. Песенькі, што дадаюцца ў сюжэты, — гэта коды, допускі ў гісторыю, дзеці іх вельмі любяць. Дарэчы, дзякуючы ім казкі лепш запамінаюцца. Калі гэтыя малыя вырастуць, ім будзе што расказаць сваім сынам і дочкам».

Між іншым, казку можна задзейнічаць не толькі ў педагагічным працэсе. Чаму б яе не выкарыстоўваць у турыстычнай галіне? Акрамя фестываляў можна ладзіць спаборніцтвы казачнікаў — напрыклад, у Расіі праводзіцца «казкабатл».

Казка тоіць яшчэ мноства сакрэтаў. «Гэта неспазнаны сусвет, у якім столькі пунктаў, комплексаў, сувязяў, якія нават на сённяшнім этапе развіцця фалькларыстыкі і іншых навук мы яшчэ не можам растлумачыць. Казкі вучаць класіфікаваць свет, адказваць за сябе, выжываць, плюс, як сцвярджаюць псіхолагі, у казачных гісторыях вельмі вялікі пласт падсвядомага, што ўвасабляецца ў вобразах, сюжэтах», — заўважае **Таццяна ВАЛОДЗІНА, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.**

Некаторым казкам, што сустракаюцца ў Беларусі, тысячы гадоў. У часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай на нашу тэрыторыю трапіла вялізная колькасць вандроўных еўрапейскіх сюжэтаў, у нас яны набылі свае дэталі, але захавалі выразную замежную аснову, каларыт. Зразумела, ёсць у нас і адметныя казкі — напрыклад пра асілкаў. Існуе шмат легендарных сюжэтаў пра тое, як такія персанажы мянялі ландшафт: насыпалі горы, перакідваліся камянямі, молатамі. Таксама на Беларусі можна сустрэць шэраг непаўторных гісторый пра жывёл. Але дзіва: казкі пра зуброў у беларусаў не было, і наогул гэтая жывёліна не была прадстаўлена ў міфалогіі, яе няма ні ў загадках, ні ў песнях. Затое другі персанаж, які зараз моцна тыражуецца, — бусел, — быў задзейнічаны ў самых розных жанрах. Легенда пра бусloў (калі чалавек ператвараецца ў птушку) вядома па ўсёй тэрыторыі Беларусі ў шматлікіх варыянтах. Часам у бусла нават ёсць імя — Адам (або Сцяпан, Іван). Гэта легенда паўтарае класічны міф пра Пандору. Нават існуе гіпотэза, што гісторыя пра бусла больш старажытная, бо звязаная з канкрэтнымі, а не абстрактнымі з'явамі. Нагадаю, што бусел выпускае з торбачкі жаб, змей, а Пандора — злосць, зайздрасць і г. д...

Сёння казачная спадчына чакае і сваіх даследчыкаў, і сваіх прыхільнікаў. Яно і не дзіва, бо, кажуць, казка — як галаграма — той выпадак, калі праз малое можна спазнаць увесь свет.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

■ Жыццёвае


Фота носіць ілюстрацыйны характар.

# ЧЫРВОНЫ ВУГОЛЬЧЫК

Чырвоны Вугольчык жыў у печы, колькі сябе помніў. Печка была старая, даўно зробленая з чырвонай цэглы працавітымі рукамі дзеда Васіля. Звонку яна была абкладзена гладкай белай кафляй, якая ад часу патрэскалася, дзе-нідзе абвальвалася, грукаючы аб падлогу і рассыпаючы па ёй рудаватыя гліняныя пясчынкі.

Калі адчынялася засланка печы, Чырвоны Вугольчык мог бачыць хату. Яна была прасторная, са слядамі колішняй утульнасці, але цяпер запушчаная і недагледжаная. Падлогу рэдка мялі, яшчэ радзей мылі. Рабіў гэта звычайна за ўсё Косцік. Шпалеры на сценах месцамі адышлі, месцамі адарваліся. Дзесьці выцвілі, дзесьці забрудзіліся. Фіранкі на вокнах таксама прасіліся, каб іх змянілі і вымылі. «Дзіўна, — думаў Чырвоны Вугольчык, — не так шмат часу трэба, каб навесці тут парадак. Чаму вялікія людзі гэтага не зробяць?»

Людзей у хаце было пяцёра: двое вялікіх і трое малых. З вялікіх найчасцей Вугольчык бачыў Сямёна і Анжэлу...

Чырвоны Вугольчык памятаў той час, калі гаспадарамі ў хаце былі дзед Васіль і бабуля Наста. Раніцай адчынялася засланка і клапатлівыя спрацаваныя рукі запальвалі агонь, ставілі варыцца ежу сабе і невялікай гаспадарцы: курам і парсючку. З печы Вугольчыку было відаць, як дзед Васіль прыносіў дровы і ішоў па ваду, як дружна сям'я сядала за стол і снедала. Побач з бацькамі сядзелі падрослыя сыны. Хутка старэйшы з'ехаў у горад, вывучыўся ды там і застаўся. Малодшы Сямён пасля арміі вярнуўся ў бацькоўскі пасёлак. Дзеда Васіля да таго часу ўжо ў жывых не было.

— Сынок, — пачуў аднойчы Вугольчык ласкавы голас бабулі Насты, — не атрымалася з паступленнем — давай уладкоўвацца на працу хоць куды.

— Паспею яшчэ, — лянiва адгукнуўся Сямён.

Працаваць хлопец сапраўды не спяшаўся. Ён часта кудысьці сыходзіў, прыходзіў дзіўным, кіруючыся да ложка, ледзь трымаўся на нагах, падаў і засынаў. Спаў да абеда, ізноў кудысьці ішоў, і ўсё паўтаралася. Штосьці змяніць не дапамагалі ні ўгаворы, ні плач, ні сварка бабулі Насты. Сямён не жадаў працаваць, затое любіў ужываць напой з назвай «гарэлка». Чырвоны Вугольчык ведаў цяпер, што гэта ад яе хлопец рабіўся такі дзіўны.

Аднойчы Сямён прывёў у хату маладую жанчыну з хлопчыкам, аб'явіўшы, што гэта яго «баба» і цяпер яна са сваім сынам будзе тут жыць.

Спачатку Чырвоны Вугольчык узрадаваўся: бабулі Насце ўжо стала цяжка спраўляцца з гаспадаркай, Анжэла будзе дапамагаць, можа, і Сямён зменіцца на лепшае. А яшчэ Вугольчыку надта ж спадабаўся Анжэлін сынок Косцік. Так і было, але нядоўга. Аказалася, што радасць Вугольчыка была паспешлівай, бо дзіўны напой «гарэлка» Анжэле чамусьці таксама вельмі спадабаўся.

Хутка не стала ў хаце і бабулі Насты: не перажыла маці ўсё, што тут адбывалася... Затое з'явіліся дзве маленькія дзяўчынкі — Ленка і Люська, дочкі-блізняткі.

Цяпер усё часцей не Анжэліны рукі бачыў раніцай Чырвоны Вугольчык, а Косцікавы. Малы, як умеў, распальваў печ, чым было — карміў сястрычак і бег у школу.

Зараз у хаце ледзь не штодня бывалі чужыя людзі. Яны былі вельмі розныя. Шумныя мужчыны і жанчыны з'яўляліся пераважна ўвечары. Сядалі за стол, пачыналі гучна размаўляць, лаяцца, бывала, біцца... Ад гэтага прачыналіся маленькія Ленка з Люськай, і да Вугольчыка даносіўся іх спалоханы плач.

Удзень прыходзілі іншыя людзі. Па двое, па трое. Чырвоны Вугольчык усіх іх ужо вывучыў. Часцей за ўсіх прыходзіла Косцікава настаўніца. Яна ўшчувала Сямёна і Анжэлу, гаварыла пра сем'і, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы... Чырвоны Вугольчык мала што разумеў, але ён адчуваў дабрыню і бездапаможнасць настаўніцы ў гэтай бядзе: Сямён і Анжэла слухалі, ківалі, згаджаліся, але нічога ў хаце не зрушвалася ў лепшы бок. Разам з настаўніцай нярэдка быў мужчына ў зеленаватай форме — пажарны інспектар Іван Пятровіч. Ён часта вымаўляў незразумелыя словы «пажарны апавяшчальнік», кажучы, што ён павінен быць у хаце. Часам бываў і ўчастковы міліцыянер...

Леначка і Люська ўжо навучыліся хадзіць. Чырвоны Вугольчык з задавальненнем слухаў іх вясёлы шчэбет, калі прыходзіў са школы Косцік. Ён сумаваў, чуючы спалоханы плач малых падчас вячэрніх застольляў вялікіх людзей.

Час ішоў, малыя раслі, дарослыя не мяняліся... Больш таго, яны цяпер маглі пакінуць дзяцей адных нават на ноч.

Аднойчы Чырвоны Вугольчык прыдрамаў пасля доўгай ранняй работы: Косцік паліў у печы перад школай. У хаце былі толькі малодшыя дзяўчаткі. Вялікія людзі з учарашняга дня некуды зніклі, як гэта часта цяпер бывала. Вугольчык праз дрымоту чуў, як сястрычкі гаманілі, елі пакінуты Косцікам сняданак, гулялі. Але цацак у хаце амаль не было, і дзяўчаткі засумавалі. Раптам быццам хтосьці штурхануў Вугольчыка і ён прачнуўся: засланка была адсунута і ў печ пазіраў цікаўны мурзаценькі тварык Люські. Чырвоны Вугольчык занерваваўся, бо раней малыя не падыходзілі так блізка да печы, тым больш не чапалі засланкі. Да Вугольчыка пацягнулася ручка з зацiснутым у ёй ліпавым прутком. «Не руш мяне, калі ласка, — хацелася крыкнуць Вугольчыку, — гэта вельмі небяспечна!»

— Ленка, памазы мне! — данёсся да Вугольчыка Люсін галасок. — Я не магу яго дастаць!

— Сто дастаць? — адгукнулася Леначка.

— Вось гэтую ялкую стуцьку. Глянь, яна свеціцца цылвоненькім!

— Залаз! Бягу, бягу!

Вугольчык не паспеў азірнуцца, як, падштурхнуты прутком, апынуўся на бруднай драўлянай падлозе. Ён адчуваў, як на паветры пачынае наліваццa моцнай разбуральнай сілай, і не хацеў гэтага. Ды малыя незнарок скінулі на падлогу яшчэ і ручнік, які вісеў каля печы. Полымя ўспыхнула адразу, і ратунку ад яго ўжо не было.

— Лена, хавайся, тут голаца, — крычала Люся і цягнула сястру за руку.

«Толькі не туды! — хацелася крыкнуць Чырвонаму Вугольчыку. — Не пад ложак! Бяжыце ад мяне на вуліцу!»

Ды дзецям, якія прывыклі быць у хаце, здавалася, што пад ложкам, дзе яны часта хаваліся ад дарослых лаянак і боек, быў самы надзейны прытулак... Здавалася да таго часу, пакуль ад дыму яны не пачалі губляць прытомнасць...

...Чырвоны Вугольчык, які ператварыўся ў шалёнае полымя, не ведаў, што толькі дзякуючы суседзям, якія, на шчасце, былі дома, ратавальнікі былі выкліканы своечасова. За імі прыехала і хуткая дапамога. Дзяўчатак з цяжкімі апёкамі даставілі ў бальніцу. У хуткім часе яны разам са старэйшым братам Косцікам апынуліся ў інтэрнаце, бо Сямёна і Анжэлу пазбавілі бацькоўскіх правоў.

У прасторнай, калісьці шчаслівай хаце ўсё нагадвала аб ранейшай трагедыі, ды за гэтым не было камуназіраць: Чырвоны Вугольчык ужо знік...

**Вольга ШВЕДАВА-ЮНІЦКАЯ**

■ Далікатная тэма

Сямейная пошта

# КАСМІЧНЫ ЦІСК ЗНІК,

## або Што бывае з мамай пасля родаў



**Я заўсёды веру ў лепшае. І яно ў маім жыцці ўжо адбылося: нарадзілася і выжыла дзіця. Сёлета восенню я адсвяткую два гады змены свайго статусу: стала мамай цудоўнай дзяўчынкі. Тэма, якую я хачу ўзняць, вельмі далікатная, пра яе, на жаль, мала хто гаворыць. Тым не менш лічу сваім доўгам падзяліцца выпрабаваннямі, якія перажыла, каб іншыя ведалі, што часам здараецца з жанчынамі пасля родаў.**

### ЦІ ЧУЛІ ВЫ ПРА ПРЫЭКЛАМПСІЮ?

Адразу раскажу вам пра такую з'яву ў гінекалогіі, як прыэклампсія. Гэта цяжкае ўскладненне падчас цяжарнасці, якое ў некаторых выпадках пагражае жыццю маці і немаўляці. Прырода яго да канца не высветлена. Ёсць розныя тэорыі. Але, лічу, кожнай будучай маме важна ведаць пра прыкметы прыэклампсіі: высокі ціск, моцныя ацёкі па ўсім целе, наяўнасць бялку ў мачы. Калі ў вас знайшлі гэтыя прыкметы разам ці паасобку, абавязкова звярніцеся да свайго доктара. І гэта не банальная перастрахоўка! Прыэклампсія непрадказальная! У цяжкіх выпадках узнікаюць сутаргі, павышаецца і трымаецца высокі ціск і, калі своечасова не прыняць меры, могуць загінуць маці і ненароджанае дзіця.

Нягледзячы на мае дыягназы па шчытападобнай залозе і гарманальны дысбаланс, я зацяжарыла даволі хутка. Сваё дзіцятка хацела і ўжо любіла. Усю цяжарнасць хадзіла з нармальным ціскам, пра які часам жартавала ў паліклініцы: «Як там мой касмічны ціск?» (120/80 рт. сл. — **Аўт.**). Праз тыдзень пасля пачатку афіцыйнага дэкрэта здарылася нечаканае, мая клінічная сітуацыя рэзка змянілася. Тэрапеўт, гледзячы на вялізны ўзровень бялку ў мачы і на ціск 160/90, заазначыла, што ў мяне пачалася прыэклампсія і патрэбна тэрміновая шпіталізацыя. Так я трапіла ў рэанімацыю 1-й гарадской клінічнай бальніцы (далей — ГКБ). Пераначавала пад крапельніцамі з моцнымі лекамі, а раніцай, калі больш-менш стабілізаваўся ціск, мяне перавялі ў аддзяленне паталогіі цяжарнасці. Што я рабіла ў бальніцы? Здавала аналізы, хадзіла на розныя ўколы, мерала ціск па тры разы на дзень і г. д. Але значных паляпшэнняў не было. На сёмы дзень лячэння сабралі кансіліум, на якім сказалі, што мяне трэба экстранна аперыраваць. Як аказалася, ад прыэклампсіі цяжка выратавацца, маўляў, хіба што пры ўмовах поўнага кантролю за вагой і вядзення здаровага ладу жыцця. Увогуле я за гэтымі паказчыкамі сачыла, але што здарылася, тое здарылася. Галоўнае, ведайце: калі ўсё пайшло насуперак нармальнаму ходу цяжарнасці і ёсць пагроза вам і вашаму дзіцяці, тады замест звычайных родаў згаджайцеся на кесарава сячэнне і абавязкова слухайце парады дактароў!

У час шпіталізацыі ў мяне толькі пачынаўся 33 тыдзень. У нядзелю стала горш, і тады правялі аперацыю, у выніку якой нарадзілася дачка. Вельмі малога росту і вагі — яе адразу паклалі ў аддзяленне экстраннай дзіцячай рэанімацыі. Я дала згоду на правядзенне ўсёй неабходнай тэрапіі. Дзіця выхадзілі ў 1-й ГКБ і таксама, праз пару тыдняў, у РНПЦ «Маці і дзіця». Ужо пазней, калі ў паўгода дачцэ зрабілі камп'ютарную тамаграфію лёгкіх падчас абструктыўнага бранхіту, я даведалася, што з-за няспеласці лёгкіх засталіся вобласці змярцвелай тканкі. У шэсць месяцаў яе паклалі ў Гарадскую дзіцячую інфекцыйную клінічную бальніцу, ёй было цяжка дыхаць. Але бранхіт, які тады развіваўся на фоне паталогіі лёгкіх, было немагчыма вылечыць у хатніх умовах. Толькі гэта не самае страшнае. Ад прастуды немаўля можна зберагчы, і лёгкія з узростам папаўняюцца ў аб'ёме. А вось калі ў такіх неданошаных дзетак узнікаюць праблемы з апорна-рухальным апаратам ці мозгам (ацёкі, ціск), усё становіцца значна больш складаным. Дзякуй богу, у нас усё добра і такіх страшных дыягназаў няма.

### ГЭТА НЕ ПРЫСУД

Медыкі ацанілі стан дзіцяці пры нараджэнні даволі добра: 8 з 10 балаў паводле шкалы Апгар. Гэта цудоўна! Я нават дамовілася пахрысціць дачушку на трэці дзень жыцця ў рэанімацыі, чым была вельмі ўсцешана. Сваякі заказвалі саракавусты аб здароўі маці і дзіцяці ў цэрквах. Усё б добра, але ў мяне пачаўся нервовы зрыў, я перастала спаць, стала трывожнай. Нягледзячы на тое, што ў цэлым сітуацыя была нармальнай, у мяне працягваў трымацца ціск. У выпадку з прыэклампсіяй гэта здараецца: адразу пасля родаў становіцца лягчэй, але для поўнай нармалізацыі стану патрэбны час. Чаму пачаліся праблемы? Я ляжала ў агульнай палаце з мамамі і іх дзецьмі, якія днём спалі, а ноччу не давалі спакою. Пры маім дыягназе трэба было захоўваць спакой, нармальна есці і высыпацца. Я хадзіла на працэдуры, як усе, але не прызнавала, што настаў час звярнуцца да псіхолага ці псіхіятра. Вельмі стамлялася, у галаве з'явіліся негатыўныя думкі. І настаў дзень і час, калі гэта заўважылі дактары. Таму я была накіравана на далейшае стацыянарнае лячэнне ў РНПЦ псіхічнага здароўя. Ведайце, што гэта не прысуд, проста так часам здараецца.

У псіхіятрычнай клініцы было не страшна. Мяне лячылі ад пасляродавай дэпрэсіі. Я была гіперактыўнай, выяўлялася хутчэй не дэпрэсія, а неўроз. Я ўдзячная свайму доктару, якая ўважліва ставілася да сітуацыі, дапамагала мне разабрацца ва ўсім.

Акрамя мяне, у аддзяленні закрытага тыпу былі яшчэ тры такія мамы. Адна трапляла сюды пасля кожных родаў. Адзінае, чаму я там была зусім не рада, гэта спыненню лактацыі дзеля нармалізацыі ўзроўню гармонаў. Разумееце, я ўвесь час сцэджвала малако, спадзявалася, што змагу хоць бы з бутэлькі карміць дачку. Гэта было для мяне жудасным момантам, і мой доктар некалькі разоў размаўляла са мной на гэтую тэму.

Зараз часта ўзгадваю той перыяд, але галоўнае веру, што любое выпрабаванне даецца чалавеку па сілах. У сваю чаргу ўсім чытачам газеты, асабліва цяжарным жанчынам, жадаю быць здаровымі і берагчы сябе дзеля будучых дзетак.

**Кацярына ВЯРГЕЙЧЫК**, *г. Мінск.*

❍ **Каментарый загадчыка аддзялення паталогіі цяжарнасці 1-й ГКБ г. Мінска Сяргея ПАЦЭЕВА:**

— Ёсць ускладненні цяжарнасці, якія могуць прывесці да цяжкіх, непапраўных наступстваў. Да такіх можна аднесці і гіпертэнзіўныя расстройствы, адно з якіх — прыэклампсія. Раней гэта ўскладненне называлася «гестоз», «позні таксікоз». І хоць памянялася класіфікацыя, прычына прыэклампсіі дагэтуль да канца не вядома. Тым не менш дзякуючы дасягненням медыцынскай навукі ўдалося дабіцца станоўчых зрухаў у дыягностыцы і лячэнні гіпертэнзіўных расстройстваў.

Прачытаўшы аповед нашай былой пацыенткі, хацелася б сказаць вось пра што. Мы памятаем усе нашы перамогі, асабліва калі гэта перамога была выпакутавана і дазволіла даць доўгачаканае дзіця бацькам, захаваць здароўе маме. Яшчэ ўспамінаецца тое, што Кацярына безумоўна давярала нам, выконвала ўсе прызначэнні, была нацэлена на станоўчы вынік. Думаю, што такое супрацоўніцтва ўсяго медыцынскага персаналу радзільні, цяжарнай і яе сваякоў дазволіла атрымаць поспех.

Вельмі прыемна, калі нават праз некаторы час былыя пацыенткі, іх родныя і блізкія дзякуюць нам. Мы, у сваю чаргу, кажам: прыходзьце да нас яшчэ, дзяцей шмат не бывае.

■ На свае вочы

# АДНОЙЧЫ Ў ВЯЛІЗНЫМ ГОРАДЗЕ

## Першы сямейны 3D-спектакль сабраў поўную залу

**Мне пашчасціла трапіць на чарговую прэм'еру сямейнага інклюзіў-тэатра «і» — спектакль «Аднойчы ў вялізным горадзе». У глядзельнай зале быў сапраўдны аншлаг — ніводнага вольнага месца. Паглядзець п'есу прыйшло больш за 600 чалавек. На свае вушы чула, што за пяць хвілін да таго, як акцёры выйшлі на сцэну, некалькі сем'яў упрошвалі жанчын, якія правяралі білеты, пусціць іх у залу. Гатовыя былі глядзець спектакль стоячы.**

І я іх цалкам разумею. Пастаноўка, аналагаў якой яшчэ не было ў Беларусі, сапраўды ўразіла. Па-першае, сваімі неймавернымі, казачнымі 3D-дэкарацыямі. Па-другое, вялікай колькасцю акцёраў — на сцэну выйшла больш за 100 чалавек, у тым ліку і з аўтызмам. «Фішкай» спектакля стала і тое, што некаторыя дзеці выступалі разам са сваімі бацькамі. У прыватнасці, амаль у поўным складзе была прадстаўлена творчая сям'я Жыбуляў. «Асабіста для нашай сям'і спектакль незвычайны яшчэ і тым, што на сцэне разам з мамай Верай і братам Кастусём упершыню з'явіцца і наш малодшы сын Эрык, ён дэбютаваў у ролі маленькага Ісуса!» — адзначыў **паэт і літаратуразнаўца Віктар ЖЫБУЛЬ.**

П'еса пастаўлена па матывах фантастычнага апавядання Фёдара Дастаеўскага «Хлопчык у Хрыста на ёлцы». Дарэчы, яна не толькі пра ёлку, у ёй шырэйшая праблематыка — таму вельмі добра глядзіцца і цяпер, у канцы вясны.

У аснове сюжэта — гісторыя маленькага хлопчыка, які перад Калядамі страціў бацькоў і застаўся адзін у вялікім горадзе без шанцаў на дапамогу. Нечаканая адбываецца цуд — сірата трапляе на свята да Хрыста і анёлаў, дзе атрымлівае надзею на лепшую будучыню для сваёй душы. Спектакль вельмі глыбокі, філасофскі. Пра дабро і зло, абыякавасць і дабрыню, пра адзіноту ў вялізным горадзе ды тое, як гэта — быць не такім, як усе...

Дарэчы, паэтка, перакладчыца і музыкант Вера Жыбуль не толькі сыграла ў спектаклі ролю Маці Ісуса. Менавіта яна і адаптавала твор Дастаеўскага на беларускую мову. У прыватнасці, у п'есе гучалі вершы Наталлі Арсенневай і песня на словы Казіміра Сваяка. На мой погляд, своеасаблівым упрыгажэннем пастаноўкі сталі душэўныя карціны мастачкі Ганны Сілівончык. Акрамя таго, парадавала вялікая колькасць аўтэнтычных касцюмаў і іншых элементаў.

— Гэта ўжо пяты спектакль нашага тэатра і, напэўна, самы складаны і ў мастацкім, і ў тэхналагічным плане, — адзначыла **мастацкі кіраўнік інклюзіў-тэатра Ірына ПУШКАРОВА.** — Мы не проста напісалі п'есу па матывах вядомага апавядання Дастаеўскага, а пастараліся прыўнесці ў яе часцінку беларускай культуры: і беларускую мову, і беларускія абрады ды традыцыі. Я вельмі ўдзячная кампаніі velcom, якая вось ужо больш за два гады падтрымлівае пастаноўкі нашага тэатра. Без іх нічога не атрымалася б.

— Мы плануем і далей прасоўваць у Беларусі ідэю фарміравання інклюзіўнага грамадства, якое прымае людзей незалежна ад дыягназу, — дадаў **начальнік аддзела карпарацыйных камунікацый velcom Мікалай БРЭДЗЕЛЕЎ.**



Падчас спектакля маленькі Эрык так салодка спаў, што некаторыя гледачы былі ўпэўнены, што на руках Вера Жыбуль трымае лялька.

Спецыяльна на прэм'ерны паказ прыехаў **рэжысёр галандскага тэатра Kazou для дарослых акцёраў з расстройствамі аўтычнага спектра (далей — РАС) Ханс САЛЕМІНК.**

— Я ўжо больш за 28 гадоў займаюся з дарослымі акцёрамі з РАС, але аналагаў таго, што робіць сямейны інклюзіў-тэатр «і», нідзе больш не сустракаў. Два гады таму, калі ўпершыню прыехаў у Мінск і трапіў на іх спектакль, нават не змог распазнаць на сцэне ўсіх акцёраў з асаблівасцямі, — адзначыў Ханс Салемінк. — Тое, як працуюць над сацыялізацыяй асаблівых дзяцей у вашай краіне, сапраўды ўнікальна. Спадзяюся, што ў будучыні мы зможам стварыць сумесны праект з удзелам двух тэатраў. Зараз вядзём перагаворы.

Калі вы хацелі, але па нейкай прычыне не трапілі на 3D-спектакль, не засмучайцеся. Арганізатары абяцаюць, што сёлета «Аднойчы ў вялізным горадзе» яшчэ пакажуць як у сталіцы, так і ў абласных гарадах.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК**

■

# ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ — НІВОДНАЙ СВАРКІ

## Пенсіянеры пазнаёміліся ў інтэрнаце і жывуць душа ў душу

**«Усе ў інтэрнаце зайздросцяць нашаму сяброўству. Кажуць, мы добрая пара», — какетліва ўсміхаецца Галіна МАЦЮХІНА. Галіне Сяргееўне 94 гады. Яе спадарожніку Івану КАСЦЕВІЧУ — 87. Чатыры гады таму яны пазнаёміліся ў Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы. З таго часу і не расстаюцца.**



Разам пара выходзіць «падыхаць» на прыступкі — далей ужо не хапае сіл.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Пенсіянераў мы застаём на лаўцы на ганку інтэрната. «Мы тут загараем, — смяецца Іван Майсеевіч. — Пераказваем адно аднаму свае жыццё».

А расказаць кожнаму ёсць што. Іван Майсеевіч родам з Гродна, але шмат гадоў пражыў у Прыбалтыцы. Апынуўся там, бо не змог паступіць на радзіме ў тэхнікум: ён малалетні вязень, быў падчас вайны ў Германіі, а такіх установы адукацыі набіраць не хацелі. Вось мужчына і з'ехаў у Рыгу. Ажаніўся там, дзяцей выгадаваў, але грамадзянства так і не атрымаў: яго давалі толькі тым, хто ў Латвіі нарадзіўся. Таму вярнуўся ў Беларусь.

днёвы бок выходзілі. Летам мы з мужам «гінулі»: так спякотна было. Вырашылі сюды на тры месяцы пераехаць — і затрымаліся. Муж толькі год тут пабыў — памёр пасля інсульту. Цяжка гэта перажывала: мы ж усё жыццё разам.

Галіна Сяргееўна запрашае нас да сябе ў пакой. На сценах — фатаграфіі бацькоў і ўнукаў, на стале — букет бэзу. «Іван на кожнае свята мне кветкі дорыць, — хваліцца. — Да гэтага цюльпаны ў вазе стаялі. А неяк на Камароўцы букет купіў — я такіх прыгожых кветак нават не бачыла ніколі, хоць раней агарод саджала і ўсе сарты ведаю».

Амаль увесь дзень яны праводзяць разам. Глядзяць тэлевізар, абмяркоўваюць праграмы. Іван Майсеевіч, у якога зрок лепшы, чытае газеты, а потым пераказвае Галіне Сяргееўне самае цікавае.

— Ёсць у нас любімае месца — там далей, на тэрыторыі інтэрната, тры бярозы растуць. Але цяпер пешыя шпацыры ў нас рэдкія — хадзіць цяжка, — кажа пенсіянер. — У асноўным сядзім на вуліцы. Я заходжу па Галіну, забіраю яе. Падпарадкоўваецца, крочыць ззаду.

— Бо я чалавек, які ўсё жыццё некаму падпарадкоўваўся, — усміхаецца жанчына. — Іван даглядае мяне, робіць гарбату, каву. Калі ўнукі прыязджаюць, стол нам накрывае.

— Думаю, заўтра з'езджу на базар, — успамінае пра гаспадарчыя справы Іван Майсеевіч і тлумачыць: — У нас адзін халадзільнік на дваіх. Што з прадуктаў купляю? Мы мяса любім. Часам кумпячкі курыныя бяру — іх у мікрахвалёўцы лёгка гатаваць. Галіна яшчэ аматар селядца і марожанага, а я дыябетык — марожанага не ем. Мы ўжо вывучылі густы адно аднаго.

евіч. — У яе ж поўная шафа адзення: там сукенак сем—восем. А яна прывыкла да таго, у чым зараз сядзіць, кажа, ёй і ў гэтым добра.

— Вядома, у мяне шмат сукенак. Я ж працавала начальнікам вылічальнага цэнтра на «Гарызонце» — адна жанчына сярод мужчын! Вось і прыбіралася, — парыруе Галіна.

Як яшчэ бавяць час пенсіянеры? Іван Майсеевіч, напрыклад, у камп'ютары сядзіць. Адна з любімых праграм — караоке.

— Да 70-годдзя Перамогі, здаецца, давалі выплаты — 350 рублёў. Я тады і купіў камп'ютар, — успамінае суразмоўнік. — Хацеў на курсы пайсці, каб паказалі, як ім карыстацца, але яны вячэрнія, няма чым з Мінска прыехаць сюды. Таму мяне школьнікі навучылі, якія тут побач у дамах жывуць. А Галіна планшэтам карыстацца ўмее, з дачкой па «скайпе» размаўляе. Але самы любімы занятак у яе — гэта сон, — жартуе.

— Сплю шмат, дзяўчаты, — не адмаўляе пенсіянерка. — Відаць, таму, што некалі многа працавала.



Любімы занятак Івана Касцевіча — «пасядзець у камп'ютары».

Жонкі Івана Майсеевіча даўно не стала, гадоў 30 таму.

— Атрымалася так, што яна запіла, таму і рана памерла. Звычайна жанчыны скардзяцца, што мужчыны п'юць, — у мяне ўсё наадварот... Можа, і я ў нейкай ступені вінаваты, што працаваў шмат, рэдка дома бываў. Гадоў 15 мы жылі цудоўна, а потым школьныя сяброўкі жонкі прыехалі. Тыя любілі выпіць і яе ўцягнулі...

Галіна Сяргееўна — мінчанка. У вайну дапамагала ў падполлі, потым у партызанскім атрадзе. А пасля Галіну адправілі на арганізацыю музея Вялікай Айчыннай вайны. Жанчына ўспамінае, як яны рамантавалі чатырохпавярховы разбіты корпус, збіралі экспанаты.

У інтэрнаце пенсіянерка жыве дзевяць гадоў.

— У мяне кватэра была на сёмым паверсе, і вокны на паў-

Яшчэ адзін падарунак Івана Майсеевіча — наручны гадзіннік, які гаворыць. Галіна Сяргееўна пасля цяжкай хваробы дрэнна стала бачыць, а так можа паслухаць, які цяпер час.

— Але Галіна больш мяне віншуе, чым я яе. Яна багацейшая, — смяецца Іван.

Жывуць пенсіянеры ў асобных пакоях. Кажуць, іх хацелі пасяліць разам, але яны пабаяліся, што пасварацца, калі з'едуцца, і адмовіліся. У гэтым справа ці не, але за чатыры гады, што пара знаёмая, не было ніводнай сваркі.

Цікавімся: няўжо Івана Майсеевіча не спрабавалі перамяніць іншыя жанчыны? Мужчын жа ў інтэрнаце мала. Пенсіянер бянтэжыцца: не заўважаў нават. А Галіна Сяргееўна ўсё бачыла. «Калі з ім пазнаёмілася, нешта сяброўак у мяне менш стала... Але і мне мужчыны знакі ўвагі аказвалі, хоць я старэйшая. Падабалася многім».



Заўсёды ў пакоі Галіны Сяргееўны — кветкі ад Івана Майсеевіча.

— І характары, — дадае жанчына. — Вось Іван спакойны чалавек, уступчывы.

— І Галіна такая ж. Мы, напэўна, таму і сышліся, што падобныя.

Пытаемся ў Галіны Сяргееўны, ці прыбіраецца яна на спатканні. Яна ўздыхае: няма жадання, узрост не той.

— Я ёй часам раблю заўвагу, — дзеліцца Іван Майсе-

Жанчына дзеліцца, што ёй у мужчынах важныя такія якасці, як сумленнасць, праўдзівасць, уважлівасць. А Іван Майсеевіч падслухоўвае — прымае да ведама. Потым, калі мы з Галінай Сяргееўнай застанёмся сам-насам, яна прызнаецца: пашанцавала ёй сустрэць такога спадарожніка. «Іван добры чалавечак. Не ўяўляю, як бы жыла тут без яго».

# Альфонсаў прашу не турбаваць

## Хто шукае «палавінку» па газетных аб'явах

**«Шалі, сімпатычная, акуратная, адказная, жыву ў прыватным доме, незалежная ад дзяцей. Пазнаёмлюся з такім жа мужчынам, невысокім, не схільным да паўнаты, гаспадарчым, які згодны на пераезд у Віцебскую вобласць для сур'ёзных адносін. Пітушчых, судзімых, альфонсаў і дзеля цікавасці прашу не турбаваць».**

«Пенсіянер, не губляю надзею на сустрэчу з прыстойнай і простай жанчынай для стварэння сям'і. Каб у маім доме была гаспадыня».

«Цясляр, сталяр, інструмент магу трымаць у руках, нарыхтоўваю дровы. Запрашаю жанчыну да 70 гадоў для пражывання на лецішчы з красавіка да лістапада ў Маладзечанскім раёне».

«Адгукніся, адзінокі мужчына ад 80 гадоў і старэй, — аблегчыць адзіноту. Маладзейшыя не званіце. Прабачце».

Кожны тыдзень у газету «Друг пенсионера» прыходзяць дзясяткі аб'яў аб знаёмстве. Толькі ўявіце: чарга на жаночыя лісты распісана на тры месяцы наперад!

— Усе аб'явы нестандартныя: у вершаванай форме нават бываюць, — расказвае **галоўны рэдактар газеты Вольга КАСЦЮШОВА.** — Адно з самых частых пажаданняў — каб чалавек быў незалежным ад дзяцей і ўнукаў. Многія апошнім часам шукаюць прыхільнікаў здаровага ладу жыцця, каб разам займацца спортам. А па вясне жанчыны нярэдка хочуць знайсці мужчын для дапамогі на агародзе, таму запатрабаваны кандыдаты «з рукамі».

Узрост ахвотных пазнаёміцца розны: 60 гадоў, 70, 75. Шмат удоў і ўдаўцоў. У асноўным пенсіянерам важныя асабістыя якасці будучага спадарожніка. Але некаторыя — часцей жанчыны — падыходзяць да пошуку больш прыдзірліва. Спадарыні ўказваюць, напрыклад, такія крытэрыі: прыемная знешнасць, рост не менш за 175 сантыметраў, наяўнасць аўта.

Аб'явы прымаюць толькі з указаннем пашпартных даных. Гэта не капрыз рэдакцыі, а патрабаванне заканадаўства (пастановы Савета Міністраў «Аб зацвярджэнні парадку прыёму, рэгістрацыі, уліку, распаўсюджвання шлюбных аб'яў аб знаёмствах ці аб зносінах па тэлефоне ў СМІ»). Кожнаму, хто дасылае ліст, перазвоньваюць: ці праўда ён пісаў? Бо раней былі выпадкі, калі людзі, чые нумары ўказваліся, абураліся, што яны не давалі аб'яву. Або мама састарэлая захацела сына пазнаёміць, а ён супраць.

Ці «прабіваюць» ахвотных завязаць адносіны па міліцэйскай базе? У рэдакцыі кажуць, што не: спадзяюцца на прыстойнасць людзей.

Колькі пар склалася дзякуючы такой перапісцы, ужо не падлічыць. Рубрыка існуе 14 гадоў. Але ў газету часта званяць з падзякай тыя, у каго знаёмства атрымалася ўдалым. Вольга Касцюшова ўспамінае жанчыну, якая сама прапанавала, каб пра яе гісторыю напісалі на старонках выдання. Але гэта, хутчэй, рэдкасць, каб пенсіянеры захацелі афішаваць свае адносіны. Як той казаў, шчасце любіць цішыню.

**Матэрыялы падрыхтавала Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# «НЕ ЎЯЎЛЯЮ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ БЕЗ ГРОШАЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

## «Дамок за горадам купіла на 5-м курсе ўніверсітэта»

***— Ці праўда, што вы зарабілі на стрыжках сабак сабе на кватэру, машыну і лецішча?*** — першай справай цікаўлюся ў Тамары.

— Усё праўда. Акрамя кватэры ў Мінску. Набыць яе мне дапамагла мама. Калі была студэнткай, я ўмудрылася зарабіць, займаючыся любімай справай, спачатку на лецішча. А потым і на машыну. Калі ты працалюбівы і не дурань, то можна зарабіць у любой сферы. Усё залежыць ад канкрэтнага чалавека. Пры сабачым салоне, у якім працую, ёсць школа грумінгу, я там выкладаю. Гэта таксама неблагі заробак. Не першы год назіраю за людзьмі, якіх мы выпускаем. Дык вось далёка не ўсе з іх могуць дазволіць сабе кватэру ці машыну. Поспеху можна дасягнуць толькі тады, калі ты фанатычна любіш сваю справу. Для гэтага трэба пастаянна рухацца і развівацца. На першым жа занятку кажу студэнтам: заводзім сабе профіль у «Інстаграме», падпісваемся на ўсіх вядомых грумераў. Прынамсі, я падпісана на 3000 майстроў. Шторанак пад каву гартаю іх старонкі, каб быць у трэндзе, разумець, што адбываецца ў свеце. Але ж самае галоўнае — практыка. Няхай нават на першым часе бясплатная. Я ў свой час ездзіла да заводчыцы з Украіны, глядзела, як яна рыхтуе сабак да выставак. Бясплатна дапамагала ёй. Гэта мне вельмі дапамагло ў прафесійным росце. Салоннаму грумінгу вучылася ў Маскве.

***— Без чаго не ўяўляеце свайго жыцця?***

— Без грошай. Усе мае знаёмыя ведаюць, што я вельмі накіраваная на тое, каб шмат зарабляць. Заўсёды свой час пераводзіла ў фінансавы эквівалент. Грошы ў мяне асацыююцца са свабодай і незалежнасцю, яны мне патрэбныя, каб мець магчымасць падарожнічаць, развівацца, расці ў прафесіі. Я ж не маю багатага таты ці мужа-мільянера, таму разлічваю толькі на свае сілы. Інструменты для грумінгу вельмі дарагія. Адны прафесійныя нажніцы каштуюць ад 100 долараў і вышэй. А ў мяне іх каля 10. А яшчэ патрэбны фен, машынка для стрыжкі сабак, адмысловая касметыка. Купляла ўсё гэта паступова. На прафесійныя інструменты ішлі ўсе грошы, што зарабляла. Разам яны мне абышліся ў некалькі тысяч долараў.

***— І як хутка выйшлі на прыбытак?***

— Дзесьці праз тры гады штодзённай працы. На пачатку кар'еры я не цуралася любой работы, не толькі стрыгла сабак, але і абразала ім кіпцюры, чысціла вушы. Ездзіла з цяжкай сумкай пад 20 кілаграмаў да кліентаў дадому. Тады мне гэта падавалася нармальным, але цяпер разумею, што гэта было пекла. Даводзілася стрыгчы на прасавальнай дошцы ці пральнай машыне. Сабака вырываецца, бегаеш за ім па кватэры. Гаспадары хвалююцца: «Яму ж балюча!» Цяпер стрыгу выключна ў салоне ці ў сваёй кватэры, адзін пакой якой абсталявала пад рабочае месца. Купіла спецыяльны стол для грумінгу за 300 долараў з пнеўмапад'ёмнікам ды штатывам, да якога прымацоўваецца ашыйнік, каб сабака стаяў спакойна. А яшчэ я пастаянна ўкладваю грошы ў навучанне. Скончыла курсы кінолага-сакратара, кінолага-заводчыка, зараз стажыруюся на кінолага-эксперта. Ганаруся, што я ў Беларусі такі грумер, які рыхтуе да выставак пародзістых сабак. Гэта ганарова, але і вельмі адказна.

**«Некаторыя гаспадары просяць, каб я іх бусечцы крыльцы выстрыгла ці тату блёсткамі намалявала. Перад Новым годам часта фарбую сабак у Дзеда Мароза».**



«Вы лічыце, што машына ды лецішча — гэта крута? Мне здаецца, крута стварыць штосьці большае».

## «Бабуля плакала, калі ўбачыла, як я пастрыгла Б'янку»

***— Тамара, а чаму вырашылі займацца сабакамі ды вожыкамі, а не коцікамі ці хамячкамі, напрыклад?***

— Колькі сябе памятаю, у нас дома заўсёды быў заапарк. У мяне гадаваліся чарапахі, трытоны, яшчаркі, марскія свінкі ўсіх парод, мышы, пацукі, каты, рыбкі, канарэйкі, папугаі, галубы. Я нават умудралася зарабляць сабе на кішэнныя расходы, прадаючы хамячкоў, калі была малая. Пастаянна падбірала параненых ды падбітых жывёл і птушак, якіх знаходзіла на вуліцы ды прыносіла дадому. Думаю, маці з бабуляй складана было са мной жыць... Але больш за ўсё мяне цягнула да сабак. Зачытала да дзірак усе кнігі пра іх, што былі ў бібліятэцы. Выпісвала расійскі часопіс «Друг». На яго ішлі ўсе мае кішэнныя грошы.

***— А памятаеце, калі ўпершыню пастрыглі сабаку?***



Да.



Пасля.

— У дзяцінстве ў мяне быў пудзель Б'янка. Памятаю, калі вучылася ў школе, абстрыгла яго, пакуль той спаў, звычайнымі канцылярскімі нажніцамі. Атрымалася вялікае цела на тонкіх лапках. Бабуля, калі ўбачыла, плакала. Маўляў, навошта так сапсавала сабаку. Потым з сяброўкай галілі яго дзядулевым станком «Спадарожнік». Да канца школы я ўжо стрыгла чужых сабак у Пінску за сімвалічную суму. Сяброўка, дарэчы, цяпер мае свой сабачы салон у Пінску. Ды і я, калі шчыра, тады нават уявіць сабе не магла, што стану топавым грумерам, нават не чула пра такую прафесію.

***— Ведаю, што вы закончылі факультэт журналістыкі. Як сваякі адрэагавалі, што прамянялі кар'еру журналіста на сабак?***

— Мама марыла, каб я стала знакамітым журналістам і пісала пра зорак. З першага курса я пачала падпрацоўваць. Праўда, пісала не пра зорных людзей, а пра... сабак. Нават дыпломную абараняла на тэму «Кіналагічныя СМІ Беларусі». Журналісцкая дзейнасць вельмі моцна дапамагла. Я пэразнаёмілася з усімі беларускімі кінолагамі, экспертамі. Спачатку маці саромелася, што я зарабляю на жыццё на «сабачых хвастах». Калі суседзі пыталіся, чым займаецца дачка, ухілялася ад адказу. Абзывала мяне гувернанткай. Але я нікога не слухала, упэўнена ішла да сваёй мэты. Мне падаецца, што ёсць сэнс слухаць толькі парады людзей, якія жывуць так, як хочаш жыць ты.

**«Калі ты працалюбівы і не дурань, то можна зарабіць у любой сферы. Усё залежыць ад канкрэтнага чалавека».**



Да.



Пасля.

## «Набыць гадаванца ў заводчыка — як дзіця ўсынавіць»

— Каб навучыцца стрыгчы пароду, самую папулярную для грумінгу, нагледзела сабе ў інтэрнэце пудзеля за тысячу еўра ў Тальяці. Каб гэтага сабаку мне прадалі, трэба было спачатку атрымаць характарыстыку ад вядомага беларускага сабачніка. Я патэлефанавала Тамары Вячаславаўне Сармонт, эксперту міжнароднай катэгорыі па ўсіх пародах сабак. Яна сказала: «Тамара, мне трэба паглядзець умовы, у якіх ты жывеш». Яна прыязджала да мяне дадому і толькі пасля гэтага пагадзілася, што я маю права завесці пудзеля. Набыць сабаку ў заводчыка — гэта як дзіця ўсынавіць.

***— А зараз вы трымаеце дома нейкіх жывёл?***

— У мяне цяпер ёсць два мініяцюрныя сабачкі чыхуахуа. Яны вельмі зручныя, у машыне змяшчаюцца. Трымаю іх для душы, хоць, магчыма, аднаго з іх зважу налета на выстаўку. Калі шчыра, у ідэале мне хацелася б займацца развядзеннем сабак буйных парод. Я нават зарэгістравала гадавальнік рускіх чорных тэр'ераў і брусельскіх грыфонаў. Гэта вялікія сабакі па 70 кілаграм. Цяпер я іх не трымаю, бо жыву ў кватэры і ў мяне няма столькі грошай на гэта ўсё. Развядзенне — дарагое задавальненне. Гэта не пра «зарабляць», а пра «выдаткоўваць».

Таму вось ужо 10 гадоў займаюся тым, што магу сабе дазволіць, — разводжу дэкаратыўных афрыканскіх міні-вожыкаў. Гэта лабараторны від, ён не існуе ў прыродзе. Заказваю іх з Масквы, Германіі, Польшчы, Маямі. Афравожыкі маюць вялікі спектр афарбовак — зарэгістравана больш за 100. Я, калі першы раз убачыла іх на фотаздымках, вішчала ад захаплення. Такія яны міленькія.



Акрамя сабак, грумер займаецца яшчэ і развядзеннем міні-вожыкаў.

**Калі пытаюся пра незвычайныя пажаданні кліентаў, Тамара пачынае паказваць фотаздымкі на сваім тэлефоне. Сабакі-панды, сабакі-тыгры, сабакі-лісічкі, сабакі-драконы, сабакі — ружовыя феечкі, — каго там толькі няма.**

**«Грошы ў мяне асацыююцца са свабодай і незалежнасцю. Я ж не маю багатага таты ці мужа-мільянера, таму разлічваю толькі на свае сілы».**

— Яшчэ 10 гадоў таму, калі ў модзе быў гламур, на сабаках даводзілася выбрываць лагатыпы такіх марак аўтамабіляў, як «Паршэ», «Ламбарджыні», пра БМВ я наогул памаўчу. Некаторыя гаспадары просяць, каб я іх бусечцы крыльцы выстрыгла ці тату блёсткамі намалявала. Перад Новым годам часта фарбую сабак у Дзеда Мароза. Я выкарыстоўваю вельмі бяспечную фарбу на раслінных кампанентах. Яна безаміячная, таму нават калі раптам трапіць у пашчу сабаку ці на рукі чалавека, не прычыніць ніякай шкоды. Усё натуральнае, таму і дарагое. Фарба для сабак каштуе ад 100 еўра. А каб пафарбаваць аднаго сабаку, часам трэба 2-3, а то і 4 цюбікі. Але ніколі не задаволю просьбу кліента, калі гэта будзе небяспечна для здароўя яго гадаванца ці прычыніць яму боль. Бо люблю сабак, як і ўсе, хто імі займаецца.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 4.07.2018 г. в 15.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100005000819, г. Смолевичи, ул. Михайловская (участок № 2).<br>Лот № 2 – площадь 0,1482 га, кадастровый номер 624850100005000816, г. Смолевичи, ул. Вишневая (участок № 1).<br>Лот № 3 – площадь 0,1498 га, кадастровый номер 624850100001001009, г. Смолевичи, ул. Ивана Шамякина, д. 1.<br>Лот № 4 – площадь 0,1435 га, кадастровый номер 624850100004000073, г. Смолевичи, ул. Машерова (участок № 1).<br>Лот № 5 – площадь 0,0927 га, кадастровый номер 624850100004000074, г. Смолевичи, ул. Парковая, 31.<br>Лот № 6 – площадь 0,1269, кадастровый номер 624850100008000741, г. Смолевичи, ул. Николая Гусовского, 4.<br>Лот № 7 – площадь 0,1495, кадастровый номер 624850100008000146, г. Смолевичи, ул. К. Калиновского, 8.<br>Лот № 8 – площадь 0,1500, кадастровый номер 624850100008000642, г. Смолевичи, ул. И. Мележа, 110.<br>Лот № 9 – площадь 0,1500, кадастровый номер 624850100008000480, г. Смолевичи, ул. М. Богдановича, 33.<br>Лот № 6 – площадь 0,1500, кадастровый номер 624850100008000225, г. Смолевичи, ул. М. Богдановича, 29 |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельных участков | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) |
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 30 000 рублей<br>Лот № 2 – 30 000 рублей<br>Лот № 3 – 17 000 рублей<br>Лот № 4 – 27 000 рублей<br>Лот № 5 – 18 000 рублей<br>Лот № 6 – 17 000 рублей<br>Лот № 7 – 17 000 рублей<br>Лот № 8 – 17 000 рублей<br>Лот № 9 – 17 000 рублей<br>Лот № 10 – 17 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной.<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.<br>В) наличие не менее двух участников.<br>Г) без права предоставления рассрочки.<br>Д) получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лоты № 3, 6, 7, 8, 9, 10 – возможность подключения электроснабжения, газоснабжения |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной стартовой цены на р/с BY98 AKBB36410000006696200000, БИК AKBBBY21612 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиала 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, пр-т Революции, 47, УНП 600014139, ОКПО 04064735 (с пометкой «задаток за земельный участок») |

**Расходы по организации и проведению аукциона: лот № 1 – 1668,70, лот № 2 – 1831,55, лот № 3 – 1859,08, № 4 – 1704,50, № 5 – 1702,72, № 6 – 1105,9, лот № 7 – 54,0, лот № 9 – 39,0, лот № 10 – 54,0, затраты на публикацию и размещение в сети Интернет информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Порядок предварительного ознакомления на местности с продаваемым земельным участком – каждый четверг с 9.00 до 13.00.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 119.**

**Окончательный срок приема заявлений – 26.06.2018 г. 17.00.**

Контактный телефон (8 01776) 2-73-42

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

– заявление на участие в аукционе по установленной форме;

– документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);

– физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо)

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению торгового унитарного предприятия «Облкоопторг» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **магазина розничной торговли,** общей площадью **78,0 кв. м,** инв. № **600/С-159626**, расположенного на земельном участке с кадастровым номером **623688207101000059** (предоставлен на праве аренды) площадью **0,0395 га**, по адресу: **Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, д. Сады, 1Б.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **15 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 500,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **04.07.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.06.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## Извещение о проведении 12 июня 2018 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Здание «административно-бытовых и вспомогательных помещений МАЗ по ул. Машиностроителей» общей площадью 12555,8 кв. м (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/U-63596, назначение: здание административно-хозяйственное); инженерные сети (общие затраты); теплотрасса; наружные сети ливневой канализации; наружные сети фекальной канализации, наружные сети водопровода; ограждение АБК АЗ; благоустройство; логотип ЗУБР; система ПТО ПТ 7637; монорельс ПТ 7735; монорельс ПТ 7648; кран подвесной мод. ПТ 6946-03.00.000 (5 шт.); шкаф ШРС 1-26 |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, пр-т Партизанский, 154А |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 2,3887 га, кадастровый номер 500000000002009005, назначение – земельный участок для обслуживание незавершенного законсервированного капитального строения |
